

НА ЭКСКУРСІЮ. У ЗОНУ АДСЯЛЕННЯ



ДОБРАЯ ЖОНКА І ДОМА РАЙ... 5

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 КРАСАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 79 (28946)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Адносіны да людзей з інваліднасцю былі і застаюцца лакмусавай паперкай здароўя нашага грамадства. Нам усім разам трэба рабіць канкрэтныя сумесныя крокі па паляпшэнні становішча спраў па кожным асобным кірунку, паслядоўна фарміруючы ў грамадстве прынцыпова іншае стаўленне да інвалідаў, стварэнне для іх роўных магчымасцяў».*

# АД ПЕРАГАВОРАЎ ДА ДАМОЎЛЕНАСЦЯЎ

## Рабочы візіт Прэзідэнта ў Кітай пачаўся са знакавых сустрэч



Фота БелТА.

**Як паведамлялася раней, кіраўнік дзяржавы ў Пекіне прыме ўдзел у мерапрыемствах II Форуму міжнароднага супрацоўніцтва «Пояс і шлях». Запланаваны шэраг сустрэч з лідарамі краін.**

### Падтрымаем у любой сферы

У першы дзень візіту беларускі лідар сустрэўся са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.

«Сёння ў кантэксце абвастрэння гандлёвых супярэчнасцяў і нежадання некаторых краін бачыць Кітай моцным асабліва відаць, хто з'яўляецца сапраўдным сябрам, як прынята казаць у Кітаі, усепагодным. У Беларусі ніколі не было і не будзе сумненняў у правільнасці выбраных вамі ініцыятыў. Кітай заўсёды можа разлічваць на нашу падтрымку ў любой сферы, як і мы заўсёды ўпэўнены ў падтрымцы з вашага боку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы даў вельмі высокую ацэнку вынікам двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. У 2018 годзе абарот тавараў і паслуг дасягнуў амаль 4,5 млрд долараў. Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання ў Кітай за год вырас у 4,5 раза, у тым ліку малочнай прадукцыі — у 9 разоў.

У адказ Сі Цзіньпін звярнуў увагу, што за апошнія шэсць гадоў з моманту абвяшчэння ініцыятывы «Пояс і шлях» работа па яе рэалізацыі ўвянчалася поспехам. Сярод узорных праектаў супрацоўніцтва ён назваў індустрыяльны парк «Вялікі камень».

Старшыня КНР дадаў, што гатовы сумесна з Беларуссю скарыстацца магчымасцямі ў рамках «Пояса і шляху» для паглыблення ўзаемнай работы.

Пасля завяршэння сустрэчы былі падпісаны дакументы аб развіцці двухбаковага супрацоўніцтва. Сярод іх — міжурадавае пагадненне аб міжнародных аўтамабільных перавозках пасажыраў і грузаў, канцэпцыя правядзення Форуму па рэгіянальным супрацоўніцтве і развіцці ў рамках ініцыятывы «Пояс і шлях».

Дарэчы, яшчэ Сі Цзіньпін паказаў беларускаму лідару макеты футбольнага стадыёна і басейна, якія кітайскі бок мяркуе падарыць Беларусі.

### Цёпла і па-сяброўску

Пазней Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з намеснікам старшыні КНР Ван Цішанем. Апошні асабліва падкрэсліў: паміж лідарамі Беларусі і Кітая і краінамі ў цэлым усталявалася жалезнае братэрства, якое ніколі не ржавее. З абодвух бакоў прагучалі добрыя словы на адрас адзін аднаго, успаміналі візіт Ван Цішаня ў Беларусь.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Новым пастаянным прадстаўніком ПРААН у Беларусі стала Аляксандра Салаўёва.**
- Створаны рэспубліканскі савет вучнёўскай моладзі БРСМ.
- **У ЗША з'явіўся гатэль у форме гіганцкай бульбіны.**



- Сезон фантанаў у Мінску адкрыецца 26 красавіка вячэрнім шоу каля опернага тэатра.
- **Прапрацоўваецца магчымасць падключаць да электразабеспячэння аб'екты фізічных асоб па-за прыдамавой тэрыторыяй.**
- У Беларусі з пачатку года адбылося 217 лясных пажараў.
- **У рэчыцкай бальніцы шафа, якая ўпала, траўмавала 94-гадовую пацыентку.**
- Больш за 60 % офісных работнікаў маюць недастатковы ўзровень фізічнай актыўнасці.

ISSN 1990 - 763X

**Мітрапаліт ПАВЕЛ:**

# «Я ЎДЗЯЧНЫ, ШТО ГАСПОДЗЬ ПАВЁЎ МЯНЕ ПА ГЭТЫМ ШЛЯХУ»

**Напярэдадні галоўнага праваслаўнага свята карэспандэнту «Звязды» ўдалося пагутарыць з Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Паўлам. Падчас размовы Уладыка расказаў, чаму з асцярогай упершыню ехаў у Мінск у якасці мітрапаліта, калі Беларусь можа наведаць Патрыярх, як не блытаць хрысціянства з магізмам і чаму Wi-Fi лепш за ўсё ловіць у храме.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Ваша Высокапраасвяшчэнства, вы прызначаны Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі больш за пяць гадоў таму. Ехалі сюды з пэўнымі чаканнямі і стэрэатыпамі. Якія з іх спраўдзіліся, а якія не пацвердзіліся? Якое настаўленне перад прыбыццём у Мінск даў вам Патрыярх Кірыл?***

— Для мяне гэта было нечаканае прызначэнне, нягледзячы на тое, што я шмат разоў мяняў месца свайго служэння і жыхарства (мітрапаліту Паўлу послух прыходзілася несці ў многіх краінах: быў начальнікам Рускай духоўнай місіі ў Іерусаліме, кіраваў патрыяршымі прыходамі ў ЗША, Мексіцы, часова ў Канадзе, быў архіепіскапам Венскім і Аўстрыйскім. — **«Зв.»**). Я думаў, што Разань будзе апошнім месцам майго служэння, дзе завяршу свой зямны шлях. Але Святейшы Патрыярх і Свяшчэнны Сінод прынялі рашэнне прызначыць мяне ў Беларусь. Да гэтага тут я быў усяго два разы. Упершыню — на святкаванні 1000-годдзя Хрышчэння Русі, і ў 2013 годзе — пару дзён на канферэнцыі. Краіну практычна не ведаў, і ўсё для мяне было новым, цікавым. Святейшы Патрыярх Кірыл, накіроўваючы мяне сюды, сказаў: «Ведаеце, Уладыка, я вельмі люблю Беларусь і беларускі народ. Беларускі народ вельмі набожны, шматпакутны і ветлівы. Упэўнены, што і вы палюбіце краіну і народ». І гэтыя словы Святейшага ў маёй свядомасці і на маім вопыце спраўдзіліся.

Беларусы насамрэч выдатныя, набожныя, добрыя людзі. Канешне, мяне прыемна здзівіла чысціня, парадак у вялікіх гарадах і малых пасёлках. Жыхары з павагай ставяцца да свайго роднага кута.

Праваслаўная паства сустрэла мяне вельмі цёпла. Да гэтага часу я ўспамінаю тое добрае пачуццё, з якім уваходзіў у сабораны храм. Першыя хвіліны людзі з нейкім хваляваннем і нават асцярогай глядзелі на мяне, але пасля таго, як я звярнуўся да іх са словамі: «Мір вам, браты і сёстры! Як настрой?» Усе адразу натхніліся: «О, з мірам прымае! Выдатна, добра».

Павінен сказаць, людзі ўсюды выдатныя, але ў Беларусі народ асаблівы. Ён сапраўды шматпакутны. За адно толькі дваццатае стагоддзе беларусы перажылі рэвалюцыю, сталінскія рэпрэсіі, дзве сусветныя вайны, Чарнобыль, сацыяльныя катаклізмы 1990-х гадоў. Усё гэта разам лягло цяжкім крыжам на плечы нашага народа, але не змагло зламаць яго сілу духу. Ён не толькі перажыў і выстаяў у гады ліхалецця, але да зыходу дваццатага стагоддзя годна ўладкаваў жыццё ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь на трывалай падставе грамадзянскага міру, згоды і салідарнасці.

СТАР. 4

# АД ПЕРАГАВОРАЎ ДА ДАМОЎЛЕНАСЦЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах кіраўніка беларускай дзяржавы, яго сустрэча ў Пекіне з Сі Цзіньпінам у большай ступені насіла пратакольны характар. Гэта звязана з вялікай колькасцю сустрэч старшыні КНР з замежнымі лідарамі, якія прыбылі ў сталіцу Кітая для ўдзелу ў форуме «Пояс і шлях». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: бакам удалося не проста абазначыць галоўныя кірункі двухбаковага супрацоўніцтва, але і падпісаць важныя міждзяржаўныя дакументы. Беларускі лідар дадаў, што за час яго візіту бакі падпішуць звыш 20 сумесных дагавораў і пагадненняў.

Некаторыя ўжо падпісаныя. У іх ліку — міжурадавае пагадненне аб тэхніка-эканамічнай дапамозе, а таксама пагадненне паміж Дзяржаўным мытным камітэтам Беларусі і Галоўным мытным упраўленнем КНР аб узаемным прызнанні праграмы ўпаўнаважаных эканамічных аператараў Беларусі і праграмы КНР па кіраванні добрасумленнымі прадпрыемствамі.

Мемарандумы аб узаемаразуменні падпісалі Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі Беларусі і Дзяржаўная адміністрацыя па рэгуляванні рынку КНР у галіне стандартызацыі, ацэнкі адпаведнасці, метралогіі і акрэдытацыі. Таксама гэта зрабілі Міністэрства аховы здароўя Беларусі і Дзяржаўнае ўпраўленне па справах аховы здароўя КНР.

Заключаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Дзяржаўным мытным камітэтам Беларусі і Галоўным мытным упраўленнем КНР аб умацаванні партнёрства для паскоранага здзяйснення мытных аперацый у дачыненні да тавараў у рамках трансеўразійскіх чыгуначных кантэйнерных перавозак.

Паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і Галоўным мытным упраўленнем КНР падпісаны пратакол аб ветэрынарных і санітарных патрабаваннях па пастаўках у Кітай кармавых малочных прадуктаў.

### Падзелімся тэхналогіямі

Яшчэ ў першы дзень візіту Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым. Беларускі лідар адзначыў, што наша краіна зацікаўлена дзяліцца тэхналогіямі з Узбекістанам і ствараць там паспяховыя прадпрыемствы.

«Не толькі вялікія імперыі могуць дапамагаць нам з вамі. Шмат добрых тэхналогій ёсць і ў сярэдніх, малых дзяржавах. У нас ёсць тэхналогіі, якія патрэбныя Узбекістану, узбекскаму народу, вельмі падобнаму на беларусаў. У мяне асабіста ёсць азарт перанесці гэтыя тэхналогіі ва Узбекістан і стварыць там сучасныя прадпрыемствы, якія будуць прыкладам для іншых», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Гэтыя планы адлюстраваны ў дарожнай карце развіцця супрацоўніцтва дзвюх краін (дарэчы, там 155 мерапрыемстваў) — і беларускі лідар звярнуў увагу, што наша краіна вельмі дакладна выконвае намечанае. Крытэрый тут — тавараабарот, які, паводле слоў Прэзідэнта, за год вырастае на 20 %.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што Беларусь і Узбекістан могуць дасягнуць значна большых вынікаў у гандлі. Ён таксама дадаў, што наша краіна прыкладзе максімум намаганняў для рэалізацыі планаў.

У адказ Шаўкат Мірзіёеў расказаў, што асабіста кантралюе выкананне мерапрыемстваў дарожнай карты. Паводле яго слоў, бакі дамовіліся перанесці ва Узбекістан беларускія магутныя тэхналогіі, супрацоўніцтва толькі пачалося, але вынік ужо бачны.

**Паводле БелТА.**

## Парламенцкі дзённік

# У аснове парадку дня — эканоміка

**Зусім хутка — з 28 да 30 красавіка — у Мінску адбудзецца II Міжнародная парламенцкая канферэнцыя Групы падтрымкі Шаўковага шляху Парламенцкай асамблеі АБСЕ «Адзін пояс, адзін шлях: паглыбленне супрацоўніцтва ў імя ўстойлівага развіцця і росквіту». На брыфінгу намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляслаў Пірштук расказаў пра падрыхтоўку да правядзення гэтага маштабнага мерапрыемства.**

Ён нагадаў, што Група падтрымкі Шаўковага шляху была створана ў Мінску ў час правядзення 26-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ ў 2017 годзе. Тады было 17 краін-удзельніц — усе яны выказалі жаданне і ўвайшлі ў гэтую Групу. За два няпоўныя гады дадалося яшчэ сем краін. Сярод удзельніц у тым ліку і краіны Еўрасаюза, такія, як Італія, Іспанія, Францыя, Польшча, Румынія.

«Беларускі бок, безумоўна, зацікаўлены ў тым, каб мы стварылі такую іміджавую пляцоўку, чарговы раз прыцягнулі ўвагу буйных партнёраў. Мы не ўтойваем, што наш парадак дня ў асноўным будзе працаваць эканамічным блокам пытанняў. Перш за ўсё, гэта інвестыцыйная прывабнасць, — сказаў Баляслаў Пірштук. — Другое: мы з'яўляемся сувязным мостам паміж Еўразійскім эканамічным саюзам і Еўрасаюзам. У нас вельмі добрая інфраструктура, магутная лагістыка, таму па вялікім рахунку ў еўрапейцаў няма іншых калідораў, па якіх яны маглі б камунікаваць з асноўнымі партнёрамі з Захаду і Усходу».

Паводле яго слоў, Група падтрымкі Шаўковага шляху імкнецца не дубляваць функцыі АБСЕ — больш палітызаванай структуры. «Задача гэтай Групы, — зазначыў ён, — знайсці новую нішу, не паўтараючыся».

Акрамя таго, Баляслаў Пірштук расказаў, што на II Міжнароднай парламенцкай канферэнцыі Групы падтрымкі Шаўковага шляху Парламенцкай асамблеі АБСЕ будзе прыняты важны дакумент. «Мы будзем прымаць Мінскую дэкларацыю. І мы спрабуем там закласці пэўныя тэзісы і пасылы, якія былі б блізкія і зразумелыя не толькі ў Беларусі, але каб нашы партнёры былі зацікаўлены ў супрацоўніцтве. Гэта значыць, наша мэта — не проста сябе паказаць, а прыцягнуць прыхільнікаў», — растлумачыў парламентарый.

У самой дэкларацыі няма жорсткіх абавязацельстваў і тэрмінаў, проста абвяшчаюцца пэўныя тэзісы і гучыць запрашэнне да супрацоўніцтва. Дарэчы, гэта не беларуская дэкларацыя, а дэкларацыя краін-удзельніц Групы. «Мы вельмі мірныя тэмы прапануем — працаваць над ростам эканомік, павышэннем узроўню дабрабыту, стабільнасці, бяспекі ў рэгіёнах», — паведаміў ён.

Безумоўна, Беларусь на гэтай канферэнцыі пакажа свае практычныя магчымасці. Напрыклад, індустрыяльны парк. Пры гэтым намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу: важны не проста прыход інвестара і адкрыццё вытворчасцяў. Важна, каб высокатэхналагічную прадукцыю можна было прапанаваць партнёрам. «Экспартны складнік у нас, безумоўна, захаваецца досыць вялікі. Усё, што мы будзем вырабляць звыш тых аб'ёмаў, якія мы робім сёння, — зразумела, іх трэба прадаваць на экспарт. Калі ў Еўропу? Вядома, хацелася б у Еўропу», — дадаў Баляслаў Пірштук.

Парламентарый таксама адзначыў, што ў рамках канферэнцыі акцэнт будзе зроблены на інавацыі, новыя тэхналогіі і лічбавую эканоміку. «Усё гэта неабходна для суправаджэння тых праектаў, якія будуць вырастаць вакол маршруту», — сказаў ён.

Пры гэтым Баляслаў Пірштук падкрэсліў: важна, каб лічбавізацыя працавала ўсе сферы жыццядзейнасці. І гэтыя тэхналогіі вельмі нядрэнна развіты ў беларускіх партнёраў — напрыклад, у Швейцарыі. Можна выкарыстаць яе вопыт. У цэлым, у нас наладжаны добрыя кантакты і з Італіяй, Іспаніяй. «Германія — пакуль не член гэтай Групы, але таксама зацікаўлена», — расказаў ён і дадаў, што па пэўнай інфармацыі згаданая дзяржава можа летам папоўніць склад удзельнікаў Групы.

Ён таксама звярнуў увагу, што Беларусь у апошнія гады пазіцыянуецца як паспяховая міратворчая пляцоўка. «І заўважце, колькі вялікіх сур'ёзных палітычных мерапрыемстваў прайшло ў нас апошнім часам. Вядома, гэта дзякуючы ў цэлым пазіцыі дзяржавы, яе кіраўніка, МЗС краіны, — адзначыў парламентарый. — Мы бачым, якія адносіны да нас на розных міжнародных форумах, у якіх мы ўдзельнічаем».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# КІРАЎНІЦТВА АБЛАСЦЕЙ НА СУВЯЗІ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 27 красавіка. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў. Зрэшты, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.**

**Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч РАБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

**Бухгалтерский баланс общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2018 год**
**220007 г. Минск, ул. Авакяна, 19, пом. 191, к. 14, тел./факс (017) 354-12-89**

(в тыс. бел. руб.)

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2018 года | На 31 декабря 2017 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 110 | 83 | 106 |
| Запасы | 210 | 8 | 9 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 | 1 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным, товарам, работам, услугам | 240 | 14 | 15 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 38 | 49 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 306 | 268 |
| **БАЛАНС** | **300** | **450** | **448** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2018 года** | **На 31 декабря 2017 года** |
| 1 | 2 | 3 | 3 |
| Уставный капитал | 410 | 35 | 35 |
| Добавочный капитал | 450 | 153 | 151 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | 238 | 234 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 0 | 12 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 24 | 16 |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| **БАЛАНС** | | **450** | **448** |

**Отчет о прибылях и убытках общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» за 2018 год**

(в тыс. бел. руб.)

| Наименование показателя | Код строки | За январь – декабрь 2018 года | За январь – декабрь 2017 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 631 | 869 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (62) | (66) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 569 | 803 |
| Управленческие расходы | 040 | (256) | (254) |
| Прибыль от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 313 | 549 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | - | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (31) | - |
| Прибыль от текущей деятельности | 090 | 282 | 549 |
| Доходы от инвестиционной деятельности | 100 | 20 | 13 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 9 | - |
| проценты к получению | 103 | 11 | 13 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 34 | 136 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 34 | 136 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (17) | (54) |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (17) | (54) |
| Прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | 37 | 95 |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 319 | 644 |
| Налог на прибыль | 160 | (75) | (104) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 12 | (12) |
| Чистая прибыль | 210 | 256 | 528 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль | 220 | 2 | 10 |
| Совокупная прибыль | 240 | 258 | 538 |

Годовая индивидуальная отчетность ООО «Форвард-Брокер» за 2018 год в полном объеме размещена на интернет-сайте vipinsurance.by.

**АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ**
**по бухгалтерской отчетности**
**Общества с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер»**
**за период с 1 января 2018 года по 31 декабря 2018 года**

**АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ**

Наименование аудируемого лица: Общество с ограниченной ответственностью «Форвард-Брокер» (ООО «Форвард-Брокер»)

Местонахождение: 220007, г. Минск, ул. Авакяна, д.19, пом.191, комн. 14.

Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством финансов Республики Беларусь 21 апреля 2006 г., регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 806000181.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ООО «Форвард-Брокер», состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2018 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности.

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность ООО «Форвард-Брокер» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Форвард-Брокер» на 31 декабря 2018 года, а также финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

**ОСНОВАНИЕ ДЛЯ ВЫРАЖЕНИЯ АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими правилами описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности». Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики. Мы считаем, что полученные аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

Директор
частного предприятия «Аудит-конто»
(аудитор, проводивший аудит) А. Г. Гапанович

**СВЕДЕНИЯ ОБ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ:**

Наименование: Частное аудиторское унитарное предприятие «Аудит-конто».
Местонахождение: 220004 г. Минск, ул. Кальварийская, д.1-1, каб. 205.
Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом 01.02.2007 года, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190799512.
Дата подписания аудиторского заключения: 11 марта 2019 года

# ЛІЧБЫ ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ — ЯК У ЕЎРОПЕ

**Сёння па колькасці анкалагічных, гематалагічных і сардэчна-сасудзістых захворванняў насельніцтва, што пацярпела ад катастрофы на ЧАЭС, не адрозніваецца ад астатніх беларусаў.**

— Штогод усе пацярпелыя праходзяць дыспансерызацыю — 96—97 % дарослых і 100 % дзяцей. Лічбы захваральнасці не адрозніваюцца ад агульнарэспубліканскіх. Гэта сведчыць пра тое, што сістэме аховы здароўя ўдалося выканаць асноўную задачу — мінімізаваць медыцынскія наступствы аварыі, — расказвае **дырэктар РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека Аляксандр РАЖКО**.

Як растлумачыў эксперт, сістэма дыспансерызацыі скіравана ў тым ліку і на выяўленне захворванняў шчытападобнай залозы.

— Паводле вынікаў 33 гадоў, якія прайшлі з моманту катастрофы, мы разумеем, што радыенукліды ёду паўплывалі на развіццё раку адной лакалізацыі — шчытападобнай залозы. І тут важна і атрыманая доза, і тое, наколькі яна паўплывала на арганізм.

Аляксандр Ражко паведаміў, што ў Дзяржаўны рэгістр асоб, якія перанеслі радыяцыйнае ўздзеянне з прычыны катастрофы на ЧАЭС, унесена 1,5 мільёна чалавек. Яны падзелены на катэгорыі. У прыватнасці, у асобных групах рызыкі знаходзяцца ліквідатары, насельніцтва, якое эвакуіравана з 30-кіламетровай зоны, дзеці і іншыя. Усе яны праходзяць абследаванні на розных узроўнях: урачэбных амбулаторыях, раённых і абласных бальніцах, РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі, дзе, дарэчы, канцэнтруюць хворых з найбольш цяжкімі паталогіямі. У прыватнасці, тут абследуюць і лечаць пацыентаў па такіх кірунках, як імуналогія, гематалогія, эндакрыналогія.

Рост колькасці раку шчытападобнай залозы ў дзяцей і падлеткаў пачаўся праз некалькі гадоў пасля катастрофы. Калі за 15 гадоў да аварыі было зафіксавана ўсяго 19 хворых, то пасля аварыі на рак захварэла каля 830 дзяцей.

— Ніводнага з іх мы не згубілі. Сёння гэта дарослыя людзі, маюць свае сем'і і нарадзілі дзяцей, — расказвае **Уладзімір КАРАНІК, галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера, на базе якога працуе Рэспубліканскі цэнтр пухлін шчытападобнай залозы.**

Цяпер захваральнасць сярод дзяцей і падлеткаў істотна зменшылася, бо няма ўплыву радыенуклідаў. Але на даааварыйны ўзровень яна не апусцілася.

— Гэта звязана з тым, што палепшылася дыягностыка. Сёння ў дзяцей на ранняй стадыі мы выяўляем тое, што раней знаходзілі ў дарослага чалавека, калі пухліна істотна павялічвалася. Калі параўноўваць лічбы, а штогод у Беларусі выяўляецца каля 1 100 хворых на рак шчытападобнай залозы, то яны не вышэйшыя, чым у Еўропе. У год у дзяцей мы выяўляем 5-6 выпадкаў раку шчытападобнай залозы, — кажа Уладзімір Каранік.

Эксперт падкрэсліў, што ад папілярнага раку шчытападобнай залозы, прычынай якога можа служыць іанізуючае выпраменьванне, пацыенты не паміраюць. А вось ад генетычнага — медулярнага раку — выратаваць складаней. Таму ў цэнтры распрацавана праграма прэвентыўнага выдалення шчытападобнай залозы.

— Калі ў сям'і з абцяжараным анамнезам мы вызначаем генетычную паломку, гэта падстава абследаваць дзіця, бо яно мае 100-працэнтныя шанцы на рак. Калі гэту генетычную паломку выяўляем і ў дзіцяці, то выдаляем шчытападобную залозу. Самаму маленькаму пацыенту было тры гады, і калі ў выдаленай залозе мы знайшлі ўчасткі раку, якія фарміраваліся, мы зразумелі, што дзейнічаем правільна. Пацыенты з выдаленай залозай атрымліваюць гармоназамяшчальную тэрапію і могуць займацца спортам, падарожнічаць, нараджаць дзяцей і весці паўнацэннае жыццё. Час, калі раніцай трэба прыняць таблетку, надыходзіць ва ўсіх: у кагосьці ў 40 гадоў, у некага ў 60, а ў іншага — у 5 гадоў, але з гэтым можна жыць, — упэўнены Уладзімір Каранік.

**Алена КРАВЕЦ.**

Медыясфера

## МАЙСТЭРСТВА ВЕСЦІ ДЫЯЛОГ

**Упершыню падчас Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі» пройдзе Дзень піяру. Ініцыятыву, якую прапанавалі вядучыя камунікацыйныя агенцтвы краіны, падтрымала Міністэрства інфармацыі.**

«Нам здаецца, зварот да гэтай тэмы вельмі важны і своечасовы, бо ўжо ёсць нямалы назапашаны вопыт: 25 гадоў споўнілася сёлета аднаму з першых беларускіх камунікацыйных агенцтваў, 20 гадоў існуе на журфаку БДУ кафедра тэхналогій камунікацыі, — адзначае **галоўны рэдактар штотыднёвіка «Аргументы і факты» ў Беларусі, старшыня Савета заснавальнікаў Інстытута PR Ігар САКАЛОЎ.** — Але дагэтуль многія, асабліва ўсходнія партнёры, успрымаюць PR як схаваную рэкламу і блытаюць адно з другім». Між тым, гаворыць адзін з найстарэйшых айчынных піяршчыкаў, акцэнты ў рабоце прэс-службаў і PR-агенцтваў зрушыліся. Калі раней гаворка ішла пра фарміраванне лаяльнасці да пэўнай кампаніі, то цяпер задача — дабіцца ў шырокай аўдыторыі пачуцця датычнасці, а значыць, даверу і ўзаемаразумення. Уласна, тэма выкарыстання PR-тэхналогій як дадатковага канала стасункаў з шырокай аўдыторыяй, у тым ліку праз СМІ, і стане лейтматывам Дня піяру.

Удзельнікаў — а далучыцца да Дня піяру арганізатары прапанавалі шырокаму колу зацікаўленых, у тым ліку PR-спецыялістам, журналістам, прэс-службам дзяржаўных арганізацый і камерцыйных прадпрыемстваў з усіх рэгіёнаў — чакае насычаная праграма канферэнцый, майстар-класаў, прэзентацый тэарэтычных і практычных напрацовак, прафесійных дыскусій за круглым сталом, а таксама крэатыўных мерапрыемстваў ад студэнтаў і выкладчыкаў факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Егіпце падоўжаны рэжым надзвычайнага становішча



Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі ўказам падоўжыў дзеянне надзвычайнага становішча ў краіне тэрмінам на тры месяцы. Адпаведны дакумент апублікаваны ў афіцыйнай дзяржаўнай газеце, паведаміла РІА «Навіны». Падаўжэнне рэжыму надзвычайнага становішча ўступіла ў сілу з 25 красавіка. У некалькіх паўночных раёнах Сінайскага паўвострава, якія мяжуюць з Ізраілем і сектарам Газа, устанавілі каменданцкую гадзіну. Раней егіпецкія ўлады ўводзілі надзвычайнае становішча на поўначы Сінайскага паўвострава для барацьбы супраць ісламскіх экстрэмістаў. Упершыню такі рэжым быў устаноўлены пасля тэрактаў у Танта і Александрыі ў красавіку 2017 года. Тады загінула больш за 50 чалавек, яшчэ больш за 100 пацярпела.

### Цана нафты ўзляцела да сёлетняга максімуму

Цана ф'ючарса на нафту маркі Brent з пастаўкай у чэрвені пераасягнула 75 долараў за барэль, сведчаць даныя біржы ICE у Лондане. Такая цана ўсталёўвалася ўпершыню з 31 кастрычніка мінулага года. Такім чынам, кошт нафты дасягнуў максімуму з пачатку 2019-га. Цана чэрвеньскіх ф'ючарсаў на WTI вырасла да 65,94 долара за барэль. Гэта адбылося на фоне геапалітычных рызык у выглядзе санкцый ЗША супраць Ірана і Венесуэлы, сведчаць даныя таргоў. 22 красавіка стала вядома аб намеры ЗША адмовіцца ад выключэнняў у санкцыях на куплю іранскай нафты. Як вядома, адпаведная забарона з выключэннем для васьмі краін была ўведзена ў лістападзе мінулага года. У сваю чаргу ўлады Ірана прыгразілі закрыць Армузскі праліў, калі Тэгеран не зможа ім карыстацца з-за абмежавальных мераў ЗША. Цераз гэты праліў праходзіць значны аб'ём нафты, якая здабываецца ў краінах Персідскага заліва. Аналітыкі заявілі, што цана барэля працягне расці з-за дэфіцыту на рынку.

### Амерыканец выйграў у латарэю 768 мільёнаў долараў



24-гадовы жыхар амерыканскага штата Вісконсін Мануэль Франка стаў уладальнікам аднаго з найбуйнейшых выйгрышаў у гісторыі краіны. Пра гэта паведаміла The Epoch Times. Згодна з правіламі, малады чалавек мог атрымліваць грошы на працягу 29 гадоў, аднак Франка прыняў рашэнне ахвяраваць часткай выйгрышу, атрымаўшы магчымасць адразу забраць рэшту. Так, у выніку пераможца стане ўладальнікам 477 мільёнаў долараў. Пры гэтым ён абавязаны заплаціць федэральны падатак у памеры 114,5 мільёна долараў. «Мне здаецца, што гэта сон і ў любы момант я магу прачнуцца. Не верыцца, што такое магло здарыцца з такім простым хлопцам, як я. Маё жыццё сапраўды змянілася, і я з надзеяй гляджу ў будучыню», — заўважыў нараспечаны мультымільянер. Маладому чалавеку параілі звярнуцца да паслуг юрыста, каб правільна распарадзіцца грашыма і не растраціць капітал.

Надвор'е

## КАРОТКАЧАСОВЫЯ ДАЖДЖЫ, МЕСЦАМІ НАВАЛЬНІЦЫ

### А ў панядзелак чакаецца пахаладанне — да 10—17 цяпла

**На гэтым тыдні ўплыў на надвор'е ў краіне аказваў антыцыклон, цэнтр якога размяшчаўся над еўрапейскай тэрыторыяй Расіі. Стаяла цёплае і сухое надвор'е. У гэты час тэмпературны фон быў на 3—5 градусаў вышэй кліматычнай нормы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А сёння ўдзень надвор'е ў краіне ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі ў заходніх раёнах адаб'еցца ўплыў малаактыўнага франтальнага раздзелу. На большай частцы тэрыторыі істотных ападкаў не прагназуецца, толькі месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра будзе як летам — ад плюс 21 градуса да плюс 27 градусаў.

На наступны дзень надвор'е пачне мяняцца. У суботу краіна апынецца ў полі паніжанага атмасфернага ціску, сфармаваным у цёплай няўстойлівай паветранай масе. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у некаторых раёнах з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, удзень — 19—26 цяпла. Свежае паветра прыйдзе да нас у нядзелю. У гэты дзень надвор'ем будуць кіраваць маларухомыя франтальныя сістэмы. У большасці раёнаў краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах месцамі магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—13 цяпла, а ўдзень стане ад плюс 14 да плюс 20 градусаў, толькі месцамі — да 24 градусаў вышэй за нуль.

У пачатку наступнага тыдня вясна праявіць свой зменлівы нораў і істотна пахаладае. Наша краіна апынецца на перыферыі скандынаўскага антыцыклону, які быў сфарміраваны ў халадным паветры паўночных шырот, а ў паўднёвых рэгіёнах Беларусі яшчэ захаваецца ўплыў франтальнага падзелу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Будзь у курсе!

## ДЗЕ ВА ЎГОДДЗІ — НІ НАГОЙ

**У сувязі з устанаўленнем чацвёртага класа пажарнай небяспекі ў большасці рэгіёнаў краіны Міністэрства лясной гаспадаркі ініцыюе ўвядзенне забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў. Такія рашэнні прымаюцца мясцовымі органамі ўлады па хадайніцтве лесагаспадарчых устаноў або раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях.**

Па стане на 25 красавіка, забароны на наведванне лясоў уже ўведзены ў наступных рэгіёнах Гродзенскай вобласці (Гродзенскім, Шчучынскім, Мастоўскім, Дзятлаўскім, Бераставіцкім, Ваўкавыскім, Свіслацкім, Зэльвенскім, Слонімскім, Навагрудскім), а таксама ў сямі рэгіёнах Мінскай вобласці (Валожынскім, Мінскім, Уздзенскім, Старадарожскім, Смалявіцкім, Чэрвеньскім, Бярэзінскім).

Увядзенне забароны мае на ўвазе поўную адмову ад наведвання лясоў грамадзянамі (у тым ліку для прагулак, адпачынку на прыродзе і г. д.), а таксама ўезд транспарту, за выключэннем службовага.

У Мінлясгасе адзначылі, што ўвядзенне забароны на наведванне лясоў — часовая мера, скіраваная, перш за ўсё, на забеспячэнне бяспекі грамадзян, захаванасці іх маёмасці, а таксама ляснога фонду. У сувязі з гэтым Міністэрства лясной гаспадаркі просіць грамадзян з разуменнем паставіцца да сітуацыі, якая склалася.

Як правіла, меры абмежавальнага характару ўводзяцца пры наступленні чацвёртага класа пажарнай небяспекі па ўмовах надвор'я — гарачага і сухога, калі адсутнічаюць ападкі, і пажар можа пачацца ад іскры.

Найбольш буйныя пажары зафіксаваныя ў Палескім лягсасе, куды агонь прыйшоў з боку Украіны. Разам з тым найбольш частай прычынай узнікнення ляснога пажару з'яўляецца чалавечы фактар: спальванне сухой раслліннасці і смецця, кінутыя незатушаныя недакуркі і іншае.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Тушэнне пажару на Альманскіх балотах працягваецца

**Пажар на Альманскіх балотах Столінскага раёна і ў навакольных лясах працягваецца больш за двое сутак.**

— Спачатку на балоцістай мясцовасці загарэлася сухая расліннасць, — расказаў карэспандэнту газеты **намеснік старшыні Столінскага райвыканкама Сяргей СІДАРЭВІЧ.** — Агонь з ветрам перакінуўся да нас з Украіны. Там гараць ужо некалькі дзён. З балотнай сухой расліннасці полымя перайшло на лес. Згарэла 50 гектараў лесу і 150 гектараў сухой травы.

На пасяджэнні раённай камісіі па надзвычайных сітуацыях усе службы зверылі пазіцыі, было прынята рашэнне аб дадатковым прыцягненні людзей і тэхнікі. У Столінскі раён тэрмінова прыбылі ратавальнікі і супрацоўнікі лясной аховы з Лунінецкага, Ганцавіцкага, Пінскага раёнаў. На месцы працуюць два верталёты Мі-8 МНС, задзейнічаны больш за сто чалавек.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «Я ЎДЗЯЧНЫ, ШТО ГАСПОДЗЬ ПАВЁЎ МЯНЕ ПА ГЭТЫМ ШЛЯХУ»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусы сапраўды ведаюць цану міру, умеюць адстойваць, захоўваць і ўмацоўваць мір. І ў гэтым сэнсе, глыбока перакананы, сусветнай супольнасці ёсць чаму павучыцца ў Беларусі, таму што падмурак трывалага міру і згоды ў краіне заснаваны на духоўна-маральных каштоўнасцях. Наш народ валодае жыццядайнай чароўнай энергіяй, якую ён чэрпае ў веры ў Бога, малітве Богу і захоўвае адзінства Святой Праваслаўнай Царквы. Я шчыра радуюся, што маю магчымасць несці ў Белай Русі свой царкоўны послух.

***— Якія з падзей, што адбываліся ў беларускім праваслаўным асяроддзі на вашых вачах, запісалі б у падручнік па гісторыі царквы?***

— Не хачу перабольшваць свае магчымасці, таму скажу прасцей. Я прыбыў у Беларусь, як сказаў Святейшы Патрыярх, каб маліцца і працаваць разам з усёй праваслаўнай паствай. Мне належыць натхняць у веры народ Божы, прапаведаваць Евангелле, здзяйсняць набажэнствы, захоўваць адзінства святога праваслаўя, самому ісці да выратавання і весці людзей у Царства Божае.

На мой погляд, сярод падзей, якія адбыліся ў апошні час, адной з найважнейшых стала пасяджэнне Святога Сінода Рускай праваслаўнай царквы пад старшынствам Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла ў Мінску 15 кастрычніка 2018 года. Гэта першае мерапрыемства такога роду ў гісторыі нашай Царквы. Горад Мінск стаў адной з сінадальных сталіц на роўных з Масквой, Санкт-Пецярбургам, Кіевам і Геленджыкам. У гэтай падзеі ёсць важнае сімвалічнае вымярэнне: яна ўвасабляе прызнанне значнасці ўкладу праваслаўных беларусаў у будаванне царкоўнага жыцця, у нашу духоўную скарбніцу, агульную для ўсіх трох усходнеславянскіх народаў.

Яшчэ адна сапраўды гістарычная падзея: у 2017 годзе Біблейская камісія і Выдавецкі савет Беларускай праваслаўнай царквы прадставілі грамадскасці пераклад Свяшчэннага Пісання Новага Запавету на сучасную літаратурную беларускую мову. Гэты пераклад стаў вынікам 25-гадовай напружанай працы — тэалагічнай, лінгвістычнай, рэдактарскай. Дарэчы, Новы Запавет на беларускай мове быў прадстаўлены ў год 500-годдзя выдання Францыскам Скарынам Псалтыра. Гэта дазволіла падкрэсліць пераемнасць традыцый духоўнай асветы на нашай зямлі.

За мінулыя пяць гадоў у межах Беларускага Экзархата былі створаны чатыры новыя епархіі (Барысаўская, Маладзечанская, Слуцкая і Лідская) і пасвячоны чатыры епіскапы. Назіраючы сітуацыю ў Царкве знутры, магу з упэўненасцю сказаць, што гэта пасадзейнічала развіццю царкоўнага жыцця. Нашы новыя архіпастыры вельмі энергічныя, ініцыятыўныя, адукаваныя людзі, верныя Царкве, адкрытыя і даступныя для прыхаджан. Стварэнне новых епархій паўплывала на дынаміку храмабудаўніцтва, на развіццё асветніцкіх, маладзёжных і дабрачынных праектаў на месцах.

Мы чакаем яшчэ адну важную падзею, якая, спадзяёмся, адбудзецца ў 2020 годзе, — 550-годдзе з дня знаходжання Жыровіцкай іконы Божай маці і паўторнага яе знаходжання праз 50 гадоў, а таксама 500-годдзе з дня ўтварэння Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра. Гэта сапраўды грандыёзныя гістарычныя падзеі. Будзем спадзявацца, што на ўрачыстасці прыедзе Святейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, пастаянныя і часовыя члены Сінода, і зноў будзе праведзена ўжо чарговае пасяджэнне Святога Сінода.

Не ведаю, што з вышэйпералічанага ляжа ў падручнікі, судзіць тым, хто будзе гэтыя кнігі рыхтаваць.

***— Ваш папярэднік, Патрыяршы Экзарх Мітрапаліт Філарэт, які прыйшоў на свой пост у складаны час, на працягу служэння зрабіў шмат для адраджэння духоўнасці і праваслаўя на беларускай зямлі. Якія задачы вы як духоўны лідар праваслаўных беларусаў ставіце перад сабой?***

— Тое, што зрабіў Уладыка Філарэт, недаацаніць нельга. 35 гадоў ён нёс свой послух на беларускай зямлі. Гэта вельмі паважаны і масціты архіпастыр нашай Царквы. Для мяне ён мае асаблівае значэнне. Мы шмат гадоў маем зносіны, знаёмыя з 1975 года. Пад яго кіраўніцтвам я нёс послух, калі Уладыка Філарэт быў старшынёй аддзела знешніх царкоўных зносін Маскоўскага патрыярхата. Мы з ім працягваем камунікаваць і малімся. Што да майго далейшага служэння, я імкнуся рабіць тое ж, што і Уладыка Філарэт.

Да гэтага прызваныя ўсе святары — прапаведаваць Евангелле, слова Божае, самім выконваць запаведзі і заклікаць людзей да гэтага, маліцца разам з імі, захоўваць адзінства святога праваслаўя, прытрымлівацца набожнага хрысціянскага жыцця. Вышэй за гэта, напэўна, нічога няма для кожнага з нас.

***— Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж дзяржавай і Беларускай праваслаўнай царквой існуе ўжо больш за 15 гадоў. На ваш погляд, гэтага дакумента сёння дастаткова ці настаў час яго актуалізацыі?***

— Хачу сказаць, што ў той час падпісанне пагаднення стала сапраўдным прарывам у царкоўна-дзяржаўных адносінах і да гэтага часу не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Яно з'яўляецца падмуркам узаемаадносін Царквы і дзяржавы. Што датычыцца актуалізацыі пагаднення, то гэты працэс ідзе, і ён беспярэпынны. На падставе пагаднення рэгулярна падпісваюцца абноўленыя праграмы супрацоўніцтва паміж Беларускай праваслаўнай царквой і профільнымі дзяржаўнымі ведамствамі.

Нядаўні прыклад: на Беларускіх калядных чытаннях, якія адбыліся ў Мінску 29—30 лістапада 2018 года, былі падпісаныя праграмы супрацоўніцтва паміж Беларускай праваслаўнай царквой і Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і камітэтам аховы здароўя Мінгарвыканкама па пытанні дапамогі людзям з анкалагічнымі захворваннямі.

***— Прадстаўнікі праваслаўнай царквы разам з калегамі-каталікамі атрымалі прэмію «За духоўнае адраджэнне» за пераклад Бібліі на беларускую мову. Ці варта чакаць далейшых крокаў па беларусізацыі Царквы? Наколькі яна сёння адказвае на запыт вернікаў аб службах на беларускай мове?***

— Адносна ажыццяўлення перакладу Свяшчэннага Пісання Новага Запавету на сучасную беларускую мову варта нагадаць, што нашы спецыялісты больш за дваццаць пяць гадоў працавалі над гэтым. Праваслаўная група перакладала з грэчаскай мовы. У нас і зараз працягваецца праца над перакладам іншых богаслужэбных тэкстаў.

Кожны, хто жадае маліцца на роднай мове, мае такую магчымасць. Што ж датычыцца грамадскіх набажэнстваў на беларускай мове, можна сказаць, што ў нас для гэтага ёсць практычна ўсё. Але мы заклікаем не палітызаваць і не фарсіраваць тэму. У сучасным жыцці Царквы ёсць два моманты, якія патрабуюць вельмі ўважлівага і нават трапяткога стаўлення, — гэта мова і каляндар. Фарсіраваць іх рашэнне не варта, таму што гэта можа прывесці грамадства да расколу.

Яшчэ раз хачу сказаць, што забароны маліцца на роднай мове ў нас няма. У праваслаўі служэнне на нацыянальных мовах дазвалялася і віталася заўсёды, але разам з тым у Царкве ніколі не знойдзе падтрымку агрэсіўны нацыяналізм з ідэямі нацыі як каштоўнасці, вышэй за якую нічога няма. Усе разнавіднасці гэтай ідэалогіі ўяўляюць сабой прамое парушэнне другой запаведзі — стварэнне з нацыі куміра і падмену гэтым ідалам Жывога Бога. Прапаганда нацыянальнай выключнасці, няхай гэта будзе беларуская, руская ці якая-небудзь яшчэ, для нас цалкам непрымальная, таму што яна раз'ядноўвае людзей.

***— Наша маладое пакаленне моцна адрозніваецца ад сваіх бацькоў і дзядоў, прычына гэтаму — лічбавыя тэхналогіі. Выходзіць, каб прыцягнуць моладзь, Царкве трэба актывізаваць місіянерскую дзейнасць з дапамогай IT. Але ці будзе яна пасля гэтага сакральным грамадзянскім інстытутам? Ці існуе сёння ў царкоўнай дзейнасці залатая сярэдзіна паміж найноўшымі тэхналогіямі і векавымі традыцыямі?***

— Я нядаўна даведаўся пра існаванне ў інтэрнэце «электронных храмаў» і «электронных капліц». Заходзіш на сайт, хочаш паставіць свечку, выбіраеш цану, націскаеш на кнопку — і свечка запальваецца. Глядзіш, а ў цябе гэтую суму з рахунку спісалі. Заказваеце малебен, пішаце імя — і зноў спісалі грошы.

У такой «капліцы» няма ні Бога, ні хараства. Адзін толькі бізнес. І робяць гэта зусім не царкоўныя людзі. Гэта падман чыстай вады. Вы цалкам правільна задаяце пытанне: «Будзе гэта на самай справе Царква ці не?» Думаю, што не.

Потым высветлілася, што арганізатары такіх «капліц» — бізнесмены. Гэта не царква, а прафанацыя. Сёння, на жаль, мы часта сустракаемся з такой з'явай, калі адбываецца наўмысная падмена сапраўдных хрысціянскіх каштоўнасцяў забабоннай мішурой. Нядаўна мы адзначалі Уваход Гасподні ў Ерусалім. Гэта вялікае свята. А сёння многія нават не ўспамінаюць пра галоўнае яго значэнне. У сродках масавай інфармацыі, кажучы пра свята, рэкамендуюць схадзіць у храм і асвяціць вярбу, таму што яна прынясіць у дом шчасце, багацце розных пладоў зямных, будзе захоўваць ад усялякіх бед, сурокаў і цёмнай сілы. Вось і прыехалі... Нашаму народу навязваюць самы сапраўдны шаманізм, магізм, забабоны, але ніяк не хрысціянства. Вярба, нават асвячоная, сама па сабе не прынясіць людзям шчасця і не адганяе нячыстую сілу.

Такая ж сітуацыя адбываецца і на свята Грамніцы. Людзі асвячаюць свечкі і нясуць іх дадому, думаючы, што яны будуць захоўваць жыллё. Свечку трэба пакласці і ў труну нябожчыку, нібыта яна дапаможа яму прайсці праз пакуты. Сябры, гэта забабоны, страшна нават чуць пра гэта.

Да Бога не звяртаемся, не каемся, жывём па сваіх страсцях і грахах, а свечку і вярбу ўзяў — і праскочыў у Царства Нябеснае. Такому Царква не вучыць. Мы заклікаем людзей да разважлівасці, кажам: без Бога, шчырай веры, посту і малітвы немагчыма, каб ад нас адышлі цёмныя сілы. Без набожнага жыцця не магчыма ўвайсці ў Царства Нябеснае.

Што ж датычыцца электронных носьбітаў і гаджэтаў, можна сказаць, што яны рэальна палягчаюць жыццё людзей, але, з іншага боку, і закабаляюць чалавека, асабліва маладых людзей. І ў гэтай справе мы павінны мець разважлівасць. Апостал Павел казаў: «Усё мне можна, ды не ўсё на карысць».

Я часам моладзі паведамляю, што ў храме вельмі добра працуе Wi-Fi: усе разам сабраліся, звярнуліся да Бога і наша малітва палялецела проста да прастола.

***— Выказваючыся нядаўна пра сітуацыю, якая склалася ва Украінскай праваслаўнай царкве, вы адзначылі, што матывы гэтага — палітычныя. Што, на вашу думку, пераканаўча-моцнае Царква сёння можа проціпаставіць гэтым матывам?***

— Працэс палітызаваны на сто працэнтаў. Надзвычай важна, каб кожны займаўся сваёй справай. Хай шавец шые боты, пекар пячэ пірагі, палітык займаецца палітыкай, а святар — пастырствам. Як толькі палітыкі пачынаюць умешвацца ў справы царкоўныя, то ўсё... Ну прымусьце вы мяне зараз узяцца за палітыку альбо эканоміку, я ж не разумею там нічога. Я такіх праблем нараблю, што потым вельмі доўга спецыялісты не змогуць разабрацца. Так і ў царкоўных рэчах. Калі вы не ведаеце царкоўнага жыцця, не ўмешвайцеся, інакш гэта ўсё становіцца палітыкай.

Вось і цяпер тым, што стварылі ва Украіне, не прымірылі людзей. А толькі аб'ядналі дзве раскольніцкія групоўкі. Выбары прэзідэнта, якія зусім нядаўна прайшлі, паказалі, што людзі не за Зяленскага галасавалі (ніхто не ведае яго як палітыка), а былі супраць таго, што ім навязвалася. 73 % прагаласавалі супраць палітыкі Парашэнкі. Прымусіць любіць гвалтам нельга, тым больш калі пытанне датычыцца веры.

Вы паглядзіце, як аб'ядналася ўкраінская Царква. З 90 епіскапаў толькі два здраднікамі аказаліся. Сёння гэта маналітная царква на чале з блажэнным Мітрапалітам Ануфрыем. І яны выстаялі, нягледзячы на тое, што іх і білі, і гвалтам выганялі з храмаў.

Мы ж зусім нядаўна ўсё гэта праходзілі ў гісторыі. Пакаленне ХХ стагоддзя ўсё гэта перажыло.

Я памятаю, калі паступаў у семінарыю ў 1973 годзе, яшчэ жылі хрушчоўскія ганенні на Царкву. У нас нават з 15 рублёў стыпендыі вылічвалі 1 рубель 83 капейкі падаходнага падатку. Гэта супрацьзаконна было. Нам казалі: «Куды вы ідзяце, вы ўжо не патрэбныя грамадству. Вучыцеся ва ўніверсітэтах, там не будуць падаткі вылічваць». Нашы хлопцы не адступаліся: пойдзем на смерць, на вогнішча, у турму, таму што пытанне датычыцца душы чалавечай. Канстанцінопальскі Патрыярх Варфаламей раскалоў сусветнае праваслаўе, але, пакуль ён жывы, у яго ёсць магчымасць дэзавуіраваць сваё рашэнне. Спадзяёмся, што падзеі ва Украіне ніколі не паўторацца ў Беларусі.

***— У адным з інтэрв'ю вы казалі, што марылі стаць лётчыкам. Мара не спраўдзілася. Ці лічыце вы гэта праявай Божай волі? Як часта знакі Божай волі вы заўважаеце ў сваім жыцці?***

— Заўсёды іх заўважаю, але гэта асаблівая, вельмі доўгая размова. Сёння, азіраючыся на сваё жыццё, перакананы, што ўсюды было прамысленне Божае. Я ўдзячны, што Гасподзь павёў мяне па гэтым шляху. Богу слава!

***— Да Вялікадня засталося некалькі дзён, самых цяжкіх для вернікаў. Як у апошнія дні падрыхтавацца, каб адчуць значнасць і веліч самага галоўнага хрысціянскага свята?***

— Думаю, што кожнаму з нас важна сустрэць Вялікдзень, не знаходзячыся ў варожасці ні з кім. Гасподзь Ісус Хрыстос дараваў сваім забойцам, і мы, хрысціяне, павінны напярэдадні Уваскрэсення Хрыстовага дараваць нашым крыўдзіцелям.

Акрамя гэтага, вельмі важна падзяліцца Велікоднай радасцю з блізкімі, паклапаціўшыся аб тых, у каго шчасця ў жыцці мала. Светлае свята Уваскрэсення Хрыстовага — гэта цудоўная нагода для дапамогі хворым, адзінокім, малазабяспечаным людзям.

Чым больш добрых спраў напярэдадні Вялікадня і ў перыяд яго святкавання мы здзейснім, тым ярчэйшая і мацнейшая будзе радасць у нашых сэрцах. І радасць гэтую, па слове Госпада, ніхто не адбярэ ў нас!

**Марыя ДАДАЛКА.**

*Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by.*




## ДОБРАЯ ЖОНКА І ДОМА РАЙ, А БЛАГАЯ — ХОЦЬ ЦЯГУ ДАЙ

| 2 | г. Минск, пл. Привокзальная, 3 | 1,0 | 8 БАВ | 4,23 | Под размещение вендингового аппарата по продаже кофе | 0,40 | Площадь (согласно схеме) расположена в служебно-техническом здании на 1-м этаже в вестибюле гостиницы «Экспресс». Срок аренды – 3 года. (1*) |
| *1* Выполнен ремонт в соответствии с существующими требованиями современного дизайна и стиля. Номерной фонд гостиницы составляет 53 комфортных номера с категорией от третьего разряда до высшего с размещением до 96 гостей одновременно. Имеются центральное отопление, естественное освещение, в ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, метрополитен (станция «Площадь Ленина»)* | | | | | | | |
| 3 | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 1,0 | 8 БАВ | 4,23 | Под размещение стойки администратора отделения банка | 0,40 | Площадь (согласно схеме) расположена в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (отметка +4,350, 2-й этаж). Срок аренды – 3 года. (2*) |
| 4 | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 1,0 | 8 БАВ | 4,23 | Под размещение банкомата, инфокиоска, платежно-справочного терминала, валютно-обменного терминала | 0,40 | Площадь (согласно схеме) расположена в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (отметка +8,550, 3-й этаж, правое крыло вокзала, зал ожидания). Срок аренды – 3 года. (2*) |
| 5 | | 1,0 | 8 БАВ | 4,23 | | 0,40 | |
| 6 | | 1,0 | 8 БАВ | 4,23 | | 0,40 | |
| 7 | | 1,0 | 8 БАВ | 4,23 | | 0,40 | |
| 2* Имеются: центральное отопление, естественное освещение, в ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, метрополитен (станция «Площадь Ленина») | | | | | | | |
| 8 | г. Минск, ул. Вокзальная, 26В | 11,33 | 22,66 БАВ | 47,87 | Под организацию розничной торговли товарами медицинского назначения и (или) мелкого ремонта товаров медицинского назначения (оптика, контактные линзы др.), кроме лекарственных средств; организацию розничной торговли непродовольственной группой товаров (кроме товаров, бывших в употреблении, товаров ритуального назначения, товаров интимного характера и лекарственных средств) | 4,70 | Площадь расположена в пешеходном тоннеле под конкорсом (с выходом на Южную площадь). Срок аренды – 3 года. (3*) |
| 3* Год постройки – 1955 год, реконструкция – 2003 год. Имеется естественное освещение. Отсутствует центральное отопление. Рядом расположены остановки городского транспорта (ул. Дружная), пригородного и междугородного автобусного сообщения, метрополитен (станция «Площадь Ленина»). Указанный объект сдается в аренду при условии выполнения арендатором за счет собственных средств и без возмещения арендодателем каких-либо затрат работ по разработке и согласованию установленным порядком проектно-сметной документации, строительно-монтажных работ и ввода в эксплуатацию торгового павильона | | | | | | | |

БАВ – базовая арендная величина с 01.04.2019 составляет 16,90 рубля.

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **29 мая 2019 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель.**

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

– уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе от 29.05.2019 по предмету аукциона №_____**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.** *При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;*

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

– копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

– копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

– легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

– копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

– копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

– копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 29 апреля 2019 г. по 23 мая 2019 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, где указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

**Порядок определения победителя аукциона:**

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона.**

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договоры аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок: отдел аукционов** – + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** – + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** – + 375 (17) 328 36 58. **Интернет: www.mgcn.by.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Падрыхтуйцеся да насычанага і досыць напружанага тыдня. Залогам вашага поспеху стане злучэнне практычнай хваткі са здаровым славалюбствам. Неабходна сканцэнтравацца на самым галоўным і не распыляцца па дробязях. У чацвер добра займацца разбурэннем старога і даць старт новаму праекту. У пятніцу нагрузку на працы пажадана звесці да мінімуму. У выхадныя не дазваляйце блізкім шпігаваць вас маралямі.



**ЦЯЛЕЦ.** Не перагружайце сябе працай, затрымліваючыся ў офісе. Неабходна паўнавартасна адпачываць. Паспрабуйце кіраваць сваім эмацыянальным станам, каб ён не стаў разбуральным для навакольных. Цяпер час для падвядзення пэўных вынікаў і рашэння старых праблем, не варта нічога мяняць. Выхадныя пройдуць весела, у шумнай кампаніі сяброў і каханага чалавека.



**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень будзе ўдалым у розных сферах. Вы перастанеце сумнявацца ў сабе, сваім поспеху, у тым, што патрэбныя і каханыя. Усё будзе складвацца менавіта так, як хочацца. Узрасце творчы патэнцыял, з'явяцца яркія крэатыўныя ідэі, якія прынясуць поспех і прыбытак. Каханы чалавек абкружыць клопатам і ўвагай. Нядзелю прысвяціце стварэнню планаў на найбліжэйшую будучыню.



**РАК.** Асцярожна з экстравагантнымі ідэямі і прапановамі! У панядзелак ці сераду не выключаны прыкрыя перашкоды ў справах і планах, аднак вы зможаце іх хутка пераадолець. Чацвер — адзін з самых удалых дзён тыдня, шмат што паспееце вырашыць, і перад вамі могуць адкрыцца новыя магчымасці. У выхадныя паспрабуйце не паддавацца на спакуслівыя прапановы. Магчымы прыемныя весткі або нечаканы поспех.



**ЛЕЎ.** На працы прадбачацца перамены на вашу карысць, прычым не апошнюю ролю адыграе асабістае абаянне. Ёсць усе шанцы добра зарабіць і падняцца па кар'ернай лесвіцы. Прымайце рашэнні ўзважана, не спяшайцеся хапаць тое, што больш даступна. І гэта датычыцца як пакупак, дзелавых рашэнняў, так і адносін з людзьмі. Часцей стаўце сябе на месца партнёра, гэта дапаможа з поспехам вырашыць шмат заблытаных праблем на працы і дома.



**ДЗЕВА.** Выдатны тыдзень для інтэлектуальнай працы, камандзіровак і падарожжаў. У панядзелак праціпаказаная паспешнасць, рабіце ўсё нетаропка, калі хочаце пазбегнуць перанапружання і памылак. У аўторак лепш устрымацца ад актыўнай дзейнасці і лішніх кантактаў. У выхадныя ваша злёгку запушчаная хатняя гаспадарка будзе мець патрэбу ва ўвазе і абнаўленні.



**ШАЛІ.** Неабходна падвысіць свой прафесійны ўзровень, набыць новыя веды, будзьце гатовыя да перамен на працы і дадатковых патрабаванняў начальства. Пажадана больш часу праводзіць у адзіноце, што будзе карысна для вас і вашай кар'еры. Пры ўсёй шырыне натуры і пачуцці абавязку паспрабуйце захаваць заробленыя грошы для сябе. Не варта спрабаваць вырашыць чужыя фінансавыя праблемы.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні зоркі не прадракаюць цяжкасцяў і стрэсаў, надыходзіць прыкметнае пацяпленне ў вашых адносінах з Фартунай. Магчымы рэзкі кар'ерны рост і значнае павелічэнне зарплаты. У любых абставінах зможаце захаваць унутраны спакой і пазітыўны настрой ды падзяліцца гэтым з блізкімі людзьмі. Гэта ім трэба.



**СТРАЛЕЦ.** Вельмі эфектыўнымі будуць дзелавыя сустрэчы і перагаворы. Добры настрой будзе суправаджаць вас увесь тыдзень, а любыя перамены будуць да лепшага. Толькі не мітусіцеся, шануйце паслядоўнасць у любым відзе дзейнасці, каб пазбегнуць непаразуменняў. У чацвер можаце трапіць у сітуацыю, якая ўжо адбывалася з вамі калісьці. Але назапашаны вопыт дазволіць не толькі бязбольна перажыць выпрабаванне да мінулага, але і атрымаць з яго масу карысці.



**КАЗЯРОГ.** Наступілі аднастайныя працоўныя будні, зоркі з неба пакуль не для вас. Давядзецца проста выконваць заданні. Зрэшты, час спрыяльны і для старту новых бізнес-праектаў. Не забывайце аб завяршэнні старых назапашаных спраў. У пятніцу не адкладайце на потым тое, што намецілі на гэты дзень, менавіта цяпер важна не ўпусціць момант. Сваякі, магчыма, маюць патрэбу ў вашай дапамозе. Праявіце клопат і такт.



**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні можа скласціся сітуацыя, калі планы, якія доўга выношваліся і нарэшце ажыццявіліся, давядзецца мяняць з-за новых абставін. Не выключана, што варта загадзя абгаварыць умовы, на якіх вы гэта зробіце. Не спрабуйце вырашыць свае і чужыя праблемы разам, інакш да канца тыдня адчуеце ўпадак сіл. У чацвер цікаўнасць не давядзе да дабра, паспрабуйце стрымліваць сябе і не ўмешвацца ў чужыя справы.



**РЫБЫ.** Перш чым штонебудзь рабіць, падумайце. У панядзелак не спрабуйце, чаго б гэта ні каштавала, даказаць сваю праўту, у гэтай сітуацыі лепш адступіць. Жыццё пакажа, хто меў рацыю. Розныя немачы ў чацвер навядуць вас на думкі аб неабходнасці весці здаровы лад жыцця. У пятніцу звярніце пільную ўвагу на правільнае і своечасовае афармленне дакументаў. Суботу лепш прысвяціць ціхаму пасіўнаму адпачынку.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.45 | 20.31 | 14.46 |
| Віцебск — | 5.31 | 20.24 | 14.53 |
| Магілёў — | 5.35 | 20.21 | 14.46 |
| Гомель — | 5.36 | 20.13 | 14.37 |
| Гродна — | 6.01 | 20.45 | 14.44 |
| Брэст — | 6.06 | 20.41 | 14.35 |

### Месяц

*Поўня 19 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Імяніны

**Пр.** *Артамона.*
**К.** *Клаўдзіі, Марцэліны, Марыі, Васіля, Рышарда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 26 КРАСАВІКА




*Дзень памяці загінулых у радыяцыйных аварыях і катастрофах. Адзначаецца з 2004 года ў дзяржавах — членах СНД у адпаведнасці з рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД ад 19 верасня 2003 года. 20 лістапада 2007 года Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, якая абвясціла трэцяе дзесяцігоддзе пасля трагедыі на Чарнобыльскай АЭС (2006—2016) Дзесяцігоддзем рэабілітацыі і ўстойлівага развіцця пацярпелых рэгіёнаў.*

**1740** год — дата заснавання Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў. Дзейнічала да 1844 года і належала князям Радзівілам-Вітгенштэйнам. З 1767 года — пад кіраўніцтвам майстра Яна Маджарскага з горада Станіслаў (цяпер Івана-Франкоўск, Украіна), які навучаўся ткацкаму рамяству ў Стамбуле; выпускала слуцкія паясы (каля 200 вырабаў у год), шаўковыя пакрывалы, залатыя і сярэбраныя галуны, падвязкі, стужкі, нашыўкі, габелены, дываны. У 1760-я гады працавалі замежныя майстры, якія перадавалі сваё ўменне мясцовым прыгонным хлопчыкам. У 1793 годзе тут было 28 станкоў, працавала 60 майстроў. Пераўзыходзіла аналагічныя еўрапейскія фабрыкі прыгажосцю, разнастайнасцю і аздабленнем узораў.

**1899** год — нарадзіўся (вёска Замосце, цяпер Уздзенскі раён) Ілья Гурскі — пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1935—1941 гадах быў рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва», у Вялікую Айчынную вайну — газеты «За Свабодную Беларусь» і сатырычнага лістка «Партызанская дубінка», у 1944—1960-м — часопіса «Беларусь». Аўтар раманаў «У агні», «Вецер веку», «Чужы хлеб», п'ес «Новай дарогай» ды іншых. На беларускую мову перакладаў творы М. Горкага, А. Чэхава, М. Твена. Памёр у 1972 годзе. Імем Ільі Гурскага названа вуліца ў Мінску.



**1929** год — нарадзіўся Мікалай Мікітавіч Слюнькоў (вёска Гарадзец Рагачоўскага раёна), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. У 1962 годзе скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1950 года — на МТЗ, з 1960- га — дырэктар Мінскага завода запасных частак. З 1972 года 1-ы сакратар Мінскага гаркама КПБ, у 1974—1983-м намеснік старшыні Дзяржплана СССР, з 1983 года — першы сакратар ЦК КПБ, з 1987-га — сакратар, член Палітбюро ЦК КПСС. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1945** год — Беларуская ССР прынятая ў склад членаў-заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Юрыдычнай асновай для гэтага стаў прыняты Вярхоўным Саветам СССР у лютым 1944 года закон аб наданні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін.




**1792** год — на званым вечары ў мэра Страсбура Фрэдэрыка дэ Дзітрыха ўпершыню прагучала мелодыя «Марсельезы». Яе аўтар — Клод Жазэф Ружэ дэ Ліль, ваенны інжынер. У свой вольны час Ліль складаў вершы і музыку. Сам аўтар і выканаў на клавесіне напісаны ім па замове мэра дэ Дзітрыха «Ваенны гімн Рэйнскай арміі, прысвечаны маршалу дэ Люкнеру». Песня вельмі хутка стала папулярнай. А па імені атрадаў марсэльскіх добраахвотнікаў, сярод якіх яна стала асабліва папулярнай, яна атрымала назву «Марсельеза».

**1939** год — нарадзіўся Уладзіслаў Дваржэцкі, савецкі акцёр кіно. Здымаўся ў фільмах «Бег», «Салярыс», «Капітан Нема» і многіх іншых. Памёр у 1978 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Спіс мужчын у жыцці жанчыны:**
**Першы.**
**Другі.**
**Не першы.**

Урач вывучае вынікі аналізаў. Пацыент:

— Ну як, доктар?

— Можаце ўзяць крэдыт.

— Дык аддаваць няма чым.

— А вам і не прыйдзецца...

**Хлопчык, які застаўся на другі год, прадказваў аднакласнікам будучыню.**

У цырульні:

— Падстрыжыце мяне так, каб было прыгожа.

— Гэта значыць, твар адстрыгаем цалкам.

**— Я хацеў купіць табе пярсцёнак, але хапіла толькі на піва.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1270.

Нумар падпісаны ў 19.30 25 красавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
26 красавіка 2019 г. № 17 (502)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА.






# НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ — БЯСПЕКА





Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і Андрэя САЗОНАВА.

Трыццаць тры гады прайшлі з моманту катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Мы не проста памятаем, а пераадольваем цяжкія наступствы: дзякуючы адпаведным дзяржаўным праграмам (зараз рэалізуецца ўжо шостая па ліку) вяртаем да жыцця забруджаныя тэрыторыі. З матэрыялаў сённяшняга нумара вы даведаецеся, колькі ворыўнай зямлі ўдалося вярнуць у сельгасабарот, пабываеце на раней закрытай ад цікаўных вачэй тэрыторыі Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка і даведаецеся, колькі каштуе арганізаваць туды экскурсію. А таксама атрымаеце адказ на самае галоўнае пытанне: «Ці не паўторыцца больш жудасная трагедыя?» — дзеля гэтага нашы журналісты адправіліся на будаўніцтва Беларускай АЭС, дзе на свае вочы пабачылі, што робіцца для гарантавання яе бяспекі. А яшчэ падзівіліся зменам, якія адбываюцца ў горадзе энергетыкаў — Астраўцы.

Напярэдадні Радаўніцы зазірнулі ў адну з адселеных вёсак, на могілкі якой у хуткім часе прыедуць сваякі тых, хто тут пахаваны. Мы даведаліся, хто даглядае месцы вечнага спачыну там, дзе ніхто не жыве.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4—16-й стар.

З НАГОДЫ СВЯТА

## Прысвяціў жыццё служэнню краіне і яе народу

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага і пятага скліканняў Анатоль РУБІНАЎ адзначыў 80-гадовы юбілей.**

Перад пачаткам пасяджэння шостай сесіі Савета Рэспублікі шаноўнага юбіляра павіншавалі са значнай датай.

Ад імя Прэзідэнта краіны віншаванне зачытала **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА.** У віншаванні адзначаецца, што прафесійны шлях Анатоля Рубінава «стаў яркім прыкладам незвычайнай працаздольнасці, самаадданага і бескарыслівага служэння краіне і народу». Прысвяціўшы сваё жыццё навуцы, стварэнню айчыннай школы лазернай фізікі, Анатоль Рубінаў заваяваў міжнароднае прызнанне, займаючы адказныя пасады, зрабіў значны ўнёсак у станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці, удасканаленне нацыянальнага заканадаўства, умацаванне інтэграцыйных працэсаў і міжпарламенцкіх сувязяў. «На кожным этапе прафесійнай дзейнасці вы заўсёды былі верным высокім ідэалам, прынцыпам сумленнасці і справядлівасці. Ваша мудрасць, выключная прыстойнасць, адданасць інтарэсам Беларусі заслугоўвае шчырай павагі, з'яўляецца выдатным прыкладам для новых пакаленняў», — гаворыцца ў віншаванні.

Асабіста ад сябе Наталля Качанава дадала, што юбіляр — выдатны навуковец, дзяржаўны дзеяч, проста выдатны чалавек, які ўсе свае намаганні аддае таму, каб наша дзяржава квітнела. «Гэта чалавек, які жыў і жыве праблемамі краіны і яе народа, я шчыра дзякую вам за гэта», — адзначыла яна.



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Са свайго боку **спікер Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** таксама павіншаваў юбіляра, падкрэсліўшы, што ў парламенце высока цэняць бязмежную адданасць дзяржаве, прыстойнасць і мудрасць Анатоля Рубінава.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Можна выказацца



Урад вызначыў, як будуць праходзіць грамадскія слуханні па БелАЭС. стар. 15

### Кватэра замест пакоя



Якія змяненні рыхтуюцца ў новую рэдакцыю Жыллёвага кодэкса. стар. 3

### 300 кг смецця на кожнага



Што рабіць, каб беларусы «прадукавалі» менш адходаў? стар. 2

### Пазбавіцца радыефобіі



Можна падчас экскурсіі ў Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік. стар. 4, 13

### Дзе ніхто не жыве...



Хто даглядае могілкі ў зоне адчужэння? стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Наймальнікі прапануюць

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч здзейсніў рабочы візіт на Гродзеншчыну.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, ён наведаў ААТ «Гродна Азот», дзе прыняў удзел у пасяджэнні Гродзенскага абласнога саюза наймальнікаў.

Як праінфармаваў член Савета Рэспублікі, старшыня Гродзенскага абласнога саюза наймальнікаў Анатоль Грышук, саюз мае намер выйсці з ініцыятывай змен у заканадаўства ў сферы арганізацыі закупак і падрыхтоўкі кадраў. «Па выніках пасяджэння будуць падрыхтаваны прапановы ад наймальнікаў Гродзеншчыны па зменах у заканадаўства, якія дазволяць павысіць эфектыўнасць работы асобна ўзятых прадпрыемстваў і ў цэлым станоўча адаб'юцца на развіцці эканомікі», — адзначыў ён і падкрэсліў, што гаворка ідзе пра арганізацыю закупак, праведзенне тэндараў.

Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч наведаў аграгурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы», дзе прыняў удзел у закладцы алеі.

## У падтрымку глабальных мэт

**У Мінску з'явілася рабінавая алея «17 Мэт устойлівага развіцця».**

17 саджанцаў прыжываюцца на пляцоўцы каля перасячэння праспекта Незалежнасці і вуліцы Талбухіна. У закладцы новай алеі прыняла ўдзел віцэ-спікер Савета Рэспублікі, Нацыянальны каардынатар па дасягненні МУР Мар'яна Шчоткіна.

У акцыі таксама прынялі ўдзел Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Іаана Казана-Вішнявецкі, кіраўнікі і работнікі беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый. Такім чынам яны падкрэслілі не толькі пазіцыю сваіх кампаній, якія на працягу доўгага часу рэалізуюць праекты карпаратыўнай устойлівасці і сацыяльнай адказнасці, але і асабістую зацікаўленасць у дасягненні Мэт устойлівага развіцця і захавання рэсурсаў Зямлі для нашчадкаў.

## Дзеля ўстойлівага развіцця

**У пачатку наступнага тыдня — 29—30 красавіка — у Мінску адбудзецца пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі з удзелам прадстаўнікоў Кангрэса мясцовых і рэгіянальных улад Савета Еўропы.**

Дэлегацыю Кангрэса ўзначаліць яго старшыня Андэрс Кнапэ.

Тэмай пасяджэння стане «Удасканаленне заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе пытанні мясцовага самакіравання, дзеля ўстойлівага развіцця тэрыторый». Удзельнікі мерапрыемства разглядзяць прававыя асновы мясцовага самакіравання ў Беларусі і за яе межамі. Таксама будуць абмяркоўвацца актуальныя пытанні развіцця мясцовага самакіравання і ўдасканалення дзейнасці асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў.

# АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ТРАКТАРЫ

### Абмяркоўваецца кантракт на сто мільёнаў долараў паміж Беларуссю і Бангладэш

Краіны пашыраюць двухбаковае супрацоўніцтва ў гандлі і інвестыцыях, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, дрэваапрацоўцы, адукацыі, навуцы і турызме. «Летась аб'ём нашага таваразвароту ўзрос на 18 % і, лічу, гэта не мяжа. Мы імкнёмся да таго, каб наша сумесная дзейнасць была рознабаковай, і падтрымліваем Бангладэш на міжнародных пляцоўках», — падкрэсліў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас сустрэчы з замежнай дэлегацыяй.**

Размова адбылася напярэдадні першага пасяджэння беларуска-бангладэшскай сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Міхаіл Мясніковіч выказаў упэўненасць, што міждзяржаўныя адносіны будуць развівацца дынамічна і прырастаць новымі праектамі.

— Лічу, што нам трэба актывізаваць палітычныя кантакты на ўзроўні як кіраўнікоў краін, так і парламентаў, — адзначыў спікер верхняй палаты парламента. Міхаіл Мясніковіч прапанаваў разгледзець пытанні супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі, асабліва будаўніцтва ліній электраперадачы і трансфарматарных падстанцый.

У Бангладэш дзейнічае праграма развіцця інфраструктуры энергасістэмы, і беларусы маглі б прыняць у ёй удзел дзякуючы свайму добраму нафтахімічнаму комплексу, які вырабляе канкурэнтаздольныя сінтэтычныя ніткі і валокны.

Таксама беларусы гатовыя дапамагчы ў падрыхтоўцы спецыялістаў па ядзернай бяспецы і фізічнай абароне атамнай электрастанцыі для АЭС, што будуе Бангладэш. Акрамя таго, на думку старшыні Савета Рэспублікі, неабходна паглыбляць узаемадзеянне ў навуковай, навукова-тэхнічнай і адукацыйнай сферах — гэтыя пытанні ўжо абмяркоўваліся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Бангладэш у Расійскай Федэрацыі, па сумяшчальніцтве ў Беларусі Сайфулам Хокам.

Як адзначыў **міністр камерцыі Народнай Рэспублікі Бангладэш Ціпу МУНШЫ,** узаемны тавараабмен з Беларуссю адбываецца ў галінах дарожна-будаўнічай і сельскагаспадарчай тэхнікі, скураных тавараў, фармацэўтыкі, сельскагаспадарчай тэхнікі. «Абмяркоўваем перспектыўныя сферы для павелічэння двухбаковага гандлю, шукаем баланс паміж экспартам і імпартам», — паведаміў міністр.

Па словах **намесніка міністра прамысловасці Беларусі Дзмітрыя КОРЧЫКА,** сёння заключаны кантракты па пастаўках дарожна-будаўнічай тэхнікі на 50 мільёнаў долараў, у Бангладэш зарэгістраваны сэрвісны цэнтр, які забяспечвае абслугоўванне тэхнікі пяці правінцый. Распрацоўваюцца і новыя кантракты, у тым ліку на 100 мільёнаў долараў. Беларусь павялічыць пастаўкі дарожнабудаўнічай, сельскагаспадарчай і грузавой тэхнікі ў паўднёва-азіяцкую рэспубліку.

За пастаўкамі тэхнікі, мяркуе намеснік міністра, пойдуць сэрвіс, запчасткі, а з павелічэннем долі беларускай тэхнікі — і навучанне персаналу бангладэшскага боку.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ЗАРАБІЦЬ НА АДХОДАХ

**Сёння кожны жыхар нашай краіны «прадукуе» 300 кілаграмаў смецця, якое захоўваецца на палігонах ЦКА. Як паменшыць гэтыя аб'ёмы і пачаць зарабляць на тым, што выкідаем? У Савеце Рэспублікі разгледзелі змены ў закон «Аб абыходжанні з адходамі».**

### Знізіць дакументаабарот



На разгляд членаў Савета Рэспублікі **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** прадставіў законапраект, які датычыцца змяненняў у закон «Аб абыходжанні з адходамі». Чаму наспелі змяненні? Па словах міністра, існуючы закон неабходна прывесці ў адпаведнасць з Дэкрэтам № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва».

— Законапраектам прадугледжана спрашчэнне парадку афармлення дакументаў пры перавозцы адходаў вытворчасці. У прыватнасці, суб'ектам гаспадарання пры наяўнасці таварна-транспартнай накладной даецца права перавозіць адходы без афармлення суправаджальнага пашпарта. Выключэнне — перавозка небяспечных адходаў і грузаў, якая ажыццяўляецца з захаваннем міжнародных дамоваў. Індывідуальным прадпрымальнікам і мікраарганізацыям даецца права не прызначаць адказных асоб за абыходжанне з адходамі, не распрацоўваць і не зацвярджаць інструкцыі па абыходжанні з адходамі вытворчасці і нарматываў утварэння такіх адходаў, а таксама не весці іх улік і не праводзіць інвентарызацыю, — паведаміў Андрэй Худык.

Праўда, за суб'ектамі гаспадарання захоўваецца абавязкі па зборы адходаў і падзелу іх па відах, абясшкоджванні або выкарыстанні адходаў, а таксама іх санкцыянаванае захоўванне і пахаванне.

На думку міністра, ільготы, якія даюцца суб'ектам гаспадарання, будуць уплываць на стварэнне ў краіне спрыяльных умоў для развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці і дзелавой ініцыятывы, а таксама дадуць магчымасць знізіць дакументаабарот.

Акрамя таго, у законапраект уключаны асобныя нормы па ўдасканаленні заканадаўства аб абыходжанні з адходамі з улікам практыкі яго выкарыстання, а таксама іерархіі спосабаў абыходжання з адходамі, прызнаных міжнароднай супольнасцю.

Сёння ўзровень здабывання ў Беларусі другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) са складу камунальных адходаў складае каля 19 % ад агульнага аб'ёму ўтварэння. Дарэчы, летась удалося атрымаць ДМР на 2 % болей, у той час як за апошняе дзесяцігоддзе рост быў адзначаны толькі на 7 %.

— Мы бачым рэзервы ў гэтай рабоце, і яны ўжо закладзены ў зменах закона. Акрамя таго, мяркую, будзе пратакольны запіс, дзе больш шырока і выразна будзе прапісана, якія крокі мы павінны зрабіць, каб рухацца да сусветных паказчыкаў, — падкрэсліў Андрэй Худык і прывёў прыклад. — Сёння ў Швецыі выкарыстоўваюцца 99,5 % адходаў і толькі 0,5 % хаваецца — гэта два кілаграмы на чалавека. Мы ж адвозім на палігоны 300 кілаграмаў на чалавека ў год.

Адной з прычын, якая перашкаджае максімальнаму збору ДМР і выкананню суб'ектамі гаспадарання і грамадзянамі нормаў заканадаўства аб абыходжанні з адходамі ў частцы забароны пахавання ДМР, на думку міністра, з'яўляецца адсутнасць адзіных актуальных патрабаванняў арганізацыі абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі.

— Для вырашэння найскладанейшай сітуацыі ў галіне абыходжання з камунальнымі адходамі, устанаўлення адзіных для ўсіх суб'ектаў патрабаванняў па абыходжанні з ЦКА законапраектам даюцца паўнамоцтвы Мінжылкамгасу сумесна з Мінпрыроды на зацвярджэнне Тэхнічнага кодэкса ўсталяванай практыкі абыходжання з камунальнымі адходамі, якія вызначаюць адзіныя правілы абыходжання з такімі відамі адходаў, — адзначыў ён.

### Дачныя звалкі і медыцынскія адходы

Адным са спецыфічных відаў адходаў, якія патрабуюць асобнай увагі, з'яўляюцца медыцынскія адходы. Для ўстанаўлення парадку іх абясшкоджвання законапраектам даюцца паўнамоцтвы Міністэрству аховы здароўя па ўзгадненні з Мінпрыроды на вызначэнне парадку абясшкоджвання адходаў лекавых сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння і медыцынскай тэхнікі.

Больш за пяць гадоў заставалася нявырашаным пытанне карэкціроўкі класіфікатара адходаў, якія ўтвараюцца ў Беларусі. З улікам выказанай Мінюстам пазіцыі законапраектам надаюцца паўнамоцтвы Мінпрыроды на зацвярджэнне адпаведнага агульнадзяржаўнага класіфікатара.

Не засталіся без увагі і несанкцыянаваныя звалкі ў дачных масівах і гаражных кааператывах.

— Для ўдасканалення работы па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый населеных пунктаў уносяцца змены ў частцы ўключэння парадку абыходжання з адходамі, якія ўтвараюцца ў спажывецкіх кааператывах, садаводчых таварыствах. Схемы абыходжання з камунальнымі адходамі распрацоўваюцца і зацвярджаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Змяненні абумоўлены тым, што з прычыны адсутнасці сфарміраваных органаў кіравання ў садаводчых таварыстваў і гаражных кааператываў у шэрагу выпадкаў адсутнічаюць адпаведныя схемы, што прыводзіць да стварэння несанкцыянаваных звалак на прылеглай тэрыторыі, — растлумачыў Андрэй Худык.

Напрыканцы міністр адзначыў, што прыняцце прапанаваных змен не прывядзе да павелічэння адміністрацыйных працэдур у дачыненні да юрыдычных асоб і ІП, а таксама грамадзян, не прадугледжвае дадатковых расходаў бюджэту і будзе спрыяць аднастайнаму выкарыстанню заканадаўчых нормаў у галіне абыходжання з адходамі, забяспечыўшы пры гэтым сістэмнае прававое рэгуляванне пытанняў у гэтай галіне.

**Генадзь ДАВЫДЗЬКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні**, дадаў, што праект закона ўзгоднены з усімі зацікаўленымі органамі дзяржаўнага кіравання.

— Мы добра разумеем, што звалкі неэфектыўныя для барацьбы з усё большым аб'ёмам адходаў. Акрамя таго, яны наносяць нямалую шкоду навакольнаму асяроддзю. Нават уладкаваныя па апошнім слове тэхнікі палігоны ствараюць цэлы комплекс экалагічных праблем. Перапрацоўваючы адходы, мы захоўваем рэсурсы і падтрымліваем навакольнае асяроддзе. І тут трэба прайсці вялікі шлях, таму што 19 % перапрацаванага смецця — гэта вельмі мала, — пераканаўы ён.

На яго думку, неабходна сур'ёзна заняцца пытаннем перапрацоўкі другасных рэсурсаў — гэта і эканоміка, і экалогія. Генадзь Давыдзька прапанаваў калегам праект закона падтрымаць і ўнесці ў пратакол пасяджэння прапанову: «Рэкамендаваць Савету Міністраў працягнуць работу па ўдасканаленні нарматыўна-прававога рэгулявання ў сферы абыходжання з адходамі з улікам сучасных патрабаванняў». Члены Савета Рэспублікі пагадзіліся з прапанаваным законапраектам.

### А як у іх?

**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў** звярнуў увагу калег на міжнародны вопыт:

— У нашых найбліжэйшых суседзяў — у Польшчы — пры некаторых органах мясцовага самакіравання існуе «Служба аховы горада». Яна ўключае шмат функцый, у тым ліку па навядзенні парадку, з правам выносіць штрафы, якія трапляюць у бюджэт мясцовай адміністрацыйнай адзінкі. Гэта вельмі важна — бо грошы можна было б накіраваць на стварэнне і фінансаванне студэнцкіх і маладзёжных атрадаў, якія таксама ўнеслі б свой пасільны ўнёсак у навядзенне парадку на зямлі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# НАВАЦЫІ ЖЫЛЛЁВАГА КОДЭКСА



**Яго новую рэдакцыю прадставіў членам Савета Рэспублікі міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ.**

У дакуменце замацоўваецца структура дзяржаўнага жыллёвага фонду, якая сёння ўяўляе сабой арэнднае жыллё, жыллё сацыяльнага карыстання, інтэрнаты і спецыяльны жыллёвы фонд (гэта дамы-інтэрнаты для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў, дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, манеўраны жылфонд).

— Пры гэтым у дачыненні да арэнднага жылля, якое актыўна развіваецца, прадугледжваецца дзеючы механізм яго выдзялення, — растлумачыў міністр.

Нароўні з забеспячэннем арэндным жыллём законапраектам прадугледжваецца захаванне сацыяльных гарантый неабароненай групе насельніцтва. Навацыяй з'яўляецца замацаванне нормаў аб выдзяленні сацыяльнага жылля не менш за аднапакаёвую кватэру (на сённяшні дзень гэта могуць быць пакоі). Сацыяльна неабароненым катэгорыям грамадзян па іх заяве таксама даецца магчымасць пераводу арэнднага жылля ў склад сацыяльнага, калі ёсць падставы не спаганяць плату за пражыванне. Гэта датычыцца адзінокіх непрацуючых пенсіянераў, інвалідаў, ветэранаў баявых дзеянняў, сем'яў, што выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, малазабяспечаных шматдзетных сем'яў і іншых.

Права на ўключэнне арэнднага фонду ў склад сацыяльнага даецца таксама дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў да дасягнення імі паўналецця. Гэтым правам, дарэчы, можна будзе скарыстацца толькі адзін раз.

## АДЛІЧЭННІ НА КАПРАМОНТ АБАРОНЯЦЬ...

З улікам прадугледжанага заканадаўствам мэтавага выкарыстання грошай без аднясення платы за капітальны рамонт у законапраект уключаны нормы, згодна з якімі спагнанне ў бясспрэчным парадку на сродкі, размешчаныя на спецрахунку райвыканкамаў, не дапускаецца.

— Гэта абумоўлена тым, што па сваёй сутнасці плата за капітальны рамонт — гэта сродкі плацельшчыкаў жыллёва-камунальных паслуг, якія іх унеслі, а не грошы арганізацый або выканкамаў, — растлумачыў Аляксандр Церахаў.

Акрамя таго, у законапраекце адлюстраваны нормы Указа № 535, які замацаваў новую структуру платы за жыллёва-камунальныя паслугі, з улікам нормаў грамадзянскага заканадаўства, што прадугледжвае агульны прынцып удзелу грамадзян і арганізацый ва ўтрыманні маёмасці суразмерна сваёй долі ў праве ўласнасці.

## ...І ЗАХАВАЮЦЬ САЦЫЯЛЬНУЮ СКІРАВАНАСЦЬ

Законапраект прадугледжвае магчымасць атрымання раўнацэннага жылля дзяржжылфонду на ўмовах раней заключаных дагавораў найму, калі, напрыклад, грамадзянін атрымаў інваліднасць, звязаную з парушэннем апорна-рухальнага апарата, і па тэхнічных прычынах немагчыма прыстасаваць яго жыллё пад безбар'ернае асяроддзе.

Рамонт жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду прадугледжваецца за кошт сродкаў уласніка маёмасці з адначасовым падзелам зоны адказнасці бакоў (наймадаўца і грамадзяніна). Прадугледжваецца захаванне патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў грамадзян, якія жывуць у дамах-інтэрнатах і не палепшылі іх за перыяд знаходжання там. А таксама першачарговае выдзяленне інтэрнатаў былым выхаванцам дзіцячых інтэрнатных устаноў.

— Прапанаваныя нормы дазволяць захаваць сацыяльную скіраванасць пры рэалізацыі жыллёвых праваў грамадзян, якія маюць патрэбу ў асаблівай увазе і падтрымцы з боку дзяржавы, — падкрэсліў міністр. — Гэтыя, а таксама шэраг іншых не менш важных прапаноў, якія паступілі ад дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у працэсе дапрацоўкі законапраекта, былі прааналізаваныя дзяржорганамі і ўключаны ў сённяшняе чытанне.

## ПРАГАЛАСАВАЦЬ ПА «ВАЙБЕРЫ»?

Наступны немалаважны блок — кіраванне агульнай маёмасцю сумесных домаўладанняў. Законапраектам прадугледжваецца ўдасканаленне нормаў, якія рэгулююць дзейнасць упаўнаважанай асобы па кіраванні агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання, выразна вызначае яго задачы. Упаўнаважаная асоба пачынае выконваць свае абавязкі з даты прыняцця мясцовым выканаўчым і распарадчым органам рашэння аб яе прызначэнні.

Удасканалены таксама парадак прыняцця рашэнняў з улікам кворуму, устанаўлення дыферэнцыраванага падыходу па прыняцці рашэння органамі кіравання таварыства ўласнікаў і арганізацый забудоўшчыкаў у залежнасці ад значнасці рашэнняў.

Таксама даецца магчымасць датэрміновага галасавання і галасавання з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій.

Па словах міністра, гэта дазволіць ахапіць і ўцягнуць у працэс кіравання агульнай маёмасцю максімальную колькасць уласнікаў, у тым ліку тых, хто адсутнічае з нейкіх прычын у горадзе ці краіне.

Устаноўлены адзіныя патрабаванні для кандыдатаў у старшыні праўлення таварыстваў уласнікаў, арганізацый-забудоўшчыкаў з абавязковым атрыманнем сертыфіката аб праходжанні прафесійнай атэстацыі. Права на вызначэнне парадку праходжання атэстацыі дадзена Савету Міністраў.

— Рэалізацыя палажэнняў законапраекта пры вашым адабрэнні дазволіць на планамернай аснове ўдасканаліць сферу жыллёвых праваадносін, у тым ліку пытанні далейшага развіцця фонду арэнднага жылля, — падкрэсліў Аляксандр Церахаў.

## РАБОТА ПРАЦЯГНЕЦЦА



**Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

— Дзеючы Жыллёвы кодэкс быў прыняты ў 2012 годзе. На той момант ён цалкам рэгуляваў адносіны ў жыллёвай сферы, але жыццё не стаіць на месцы, час уносіць свае карэктывы. За апошнія гады Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка прыняў шэраг указаў па пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін: №№ 563, 535 і 240. Нядаўна выдадзена Дырэктыва № 7 «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны». Як бачыце, рашэнні па пытаннях удасканалення заканадаўства ў галіне жыллёвых адносін прымаліся на самым высокім узроўні.

Як адзначыў судакладчык, абноўлены Жыллёвы кодэкс — гэта адзіны дакумент, які сістэматызуе, аб'ядноўвае нарматыўныя акты, прынятыя за апошнія гады ў сферы жыллёвых адносін.

Ён звярнуў увагу калег на тое, што сфера жыллёвых адносін складаная і адчувальная, у ёй захоўваецца маса пытанняў і вырашаюцца яны не так хутка, як хацелася б. Гэта датычыцца капітальнага рамонту, мадэрнізацыі будынкаў старога жылога фонду, аказання якасных жыллёвых паслуг насельніцтву незалежна ад месца пражывання, паляпшэнне жыллёвых умоў тых, хто мае ў гэтым патрэбу, далейшае развіццё рынку арэнднага жылля, павелічэнне аб'ёмаў і выкарыстанне электраэнергіі ў жыллёвым фондзе ў сувязі з увядзеннем Беларускай АЭС.

— Вядома, у галіне шмат пазітыўных навацый, але шмат яшчэ і нявырашаных пытанняў. Сёння мы павінны бачыць шляхі іх вырашэння, перспектыву, таму работа па ўдасканаленні нарматыўнага рэгулявання згаданай сферы павінна быць працягнутая. Пастаянная камісія па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні прапануе дадаткова ўнесці ў пратакол рэкамендацыі Савету Міністраў працягнуць работу па распрацоўцы рашэнняў актуальных праблем у сферы жыллёвых адносін з мэтай удасканалення нарматыўна-прававога рэгулявання ў гэтай сферы, — рэзюмаваў Аляксандр Папкоў.



Члены Савета Рэспублікі пагадзіліся з прапанаванымі новаўвядзеннямі.

# Сістэма аплаты працы бюджэтнікаў зменіцца

### Навацыі датычацца структуры налічэння заробку, але не ўплываюць на яго памер

**Сутнасць змен прадставіла на нядаўнім пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**



— За перыяд свайго існавання (з пачатку 2000-х гадоў) дзеючая сістэма зведала мноства кропкавых змен, якія, з аднаго боку, былі накіраваны на рашэнне канкрэтных бягучых задач, але, з другога, — прывялі да яе разбалансіроўкі. У выніку маем сістэму аплаты працы, у якой складана разабрацца не толькі самім работнікам, але нават бухгалтарскім службам, — адзначыла яна.

З улікам гэтага была пастаўлена задача па комплексным пераглядзе сістэмы аплаты працы ў бюджэтнай сферы і вызначэнні паўнамоцтваў і задач, што рашаюцца на ўзроўні ўрада, Мінпрацы і сацабароны, іншых міністэрстваў бюджэтнай сферы. Асноўныя падыходы па комплекснай змене сістэмы аплаты працы бюджэтнікаў адлюстраваны ва Указе № 27 ад 18 студзеня 2019 года «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый».

Адным з асноўных палажэнняў дакумента з'яўляецца спрашчэнне структуры заработнай платы ў сувязі з наяўнасцю ў існуючых умовах аплаты працы мноства відаў павышэнняў, надбавак і даплат, якія вылічаюцца з розных баз. З 1 студзеня 2020 года зарплата бюджэтнікаў будзе складацца з акладу, стымулюючых і кампенсуючых выплат.

— У адпаведнасці з нормамі Указа № 27 пры ўвядзенні новай сістэмы аплаты працы норма аб дадатковых мерах стымулявання, якую павінен прадугледжваць кантракт у частцы павышэння тарыфнай стаўкі, падлягае карэкціроўцы. Па гэтай прычыне ўносяцца змены ў Дэкрэт Прэзідэнта ад 26 ліпеня 1999 г. № 29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны». У дачыненні да работнікаў бюджэтных арганізацый найменне «павышэнне тарыфнай стаўкі» падлягае замене на «надбаўку», паколькі гэтая выплата з'яўляецца стымулюючай, — растлумачыла міністр.

Варта адзначыць, што ранейшы памер надбаўкі — не больш за 50 % ад акладу работніка — застаецца нязменным.

Ці закране гэта работнікаў небюджэтнай галіны? Як растлумачыла Ірына Касцевіч, для захавання існуючай сістэмы аплаты працы ў арганізацыях рэальнага сектара эканомікі для работнікаў норма аб дадатковых мерах стымулявання ў частцы павышэння тарыфнай стаўкі ці тарыфнага акладу застаецца без змен.

Па словах міністра, рэалізацыя дэкрэта не паўплывае на велічыню даходаў і расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, паколькі змены носяць выключна рэдакцыйны характар.

**Міхаіл СІЦЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах,** пацікавіўся, наколькі зменіцца ўзровень аплаты працы работнікаў бюджэтных і прыраўнаваных да іх арганізацый у сувязі з адыходам ад «тарыфнай стаўкі»?

— Дакумент накіраваны выключна на спрашчэнне сістэмы фарміравання аплаты працы, і ў ім ёсць норма не дапусціць паніжэння заработнай платы. Указ — гэта ўдасканаленне сістэмы, а падвышэнне — гэта іншыя крокі, якія мы будзем рабіць для таго, каб у рамках новай сістэмы падняць заработную плату бюджэтнікаў, — растлумачыла Ірына Касцевіч.

Нагадаем, што павышэнне заробкаў бюджэтнікаў сёлета анансаваў **міністр фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ** на сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі і Савета Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце.

— За кошт якіх сродкаў або якога артыкула бюджэту будуць выплачвацца надбаўкі па кантрактах? — пацікавіўся **Рыгор БЫСЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.**

Як падкрэсліла міністр працы і сацыяльнай абароны, у бюджэтных арганізацыях адна крыніца — бюджэт (рэспубліканскі ці мясцовы). І менавіта адтуль накіроўваюцца рэсурсы для выдзялення надбаўкі за кантракт.

Ці можна наймальніку выкарыстоўваць на гэтыя мэты сродкі, атрыманыя па іншых артыкулах, скажам, ад эканоміі электраэнергіі?

— Тут выключна бюджэтныя рэсурсы, але для гэтага ў нас з вамі ёсць іншыя стымулюючыя і кампенсуючыя выплаты, якія будуць дазваляць кіраўніку павышаць заработную плату работніку, — растлумачыла Ірына Касцевіч. — Рычагі ёсць, трэба толькі зарабляць, каб скарыстацца імі.

**Рыгор ДВОРАК, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве**, задаў пытанне аб аб'ёме сродкаў, зрасходаваных летась на рэалізацыю дадатковых гарантый тым, хто працуе па кантрактах, прадугледжаных Дэкрэтам № 29, і сярэдняй суме ў разліку на аднаго бюджэтніка.

— У 2018 годзе гэтая лічба складала больш за 430 мільёнаў рублёў. Паколькі на кантрактнай форме найму ў бюджэтнай сферы працуе каля 180 тысяч чалавек, то сярэдняя экспертная ацэнка — 40—45 рублёў у месяц, — адказала міністр.

**Матэрыялы падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# ВЯРТАННЕ ДА ЖЫЦЦЯ

## Як аднаўляюцца тэрыторыі, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы

**У выніку катастрофы на ЧАЭС на тэрыторыі радыяцыйнага забруджвання аказалася 3678 беларускіх населеных пунктаў, у якіх пражывала звыш двух мільёнаў чалавек. 479 населеных пунктаў спынілі існаванне. З пацярпелых тэрыторый адселена 137,7 тысячы чалавек, з іх 75 працэнтаў — жыхары Гомельскай вобласці. Акрамя арганізаванай эвакуацыі, яшчэ каля 200 тысяч чалавек самастойна пакінулі свае дамы... Доўгія гады моладзь працягвала з'язджаць з праблемных зон. Але сёння з'явілася надзея, што ў многіх раёнах жыццё адновіцца. За тыя гады, што мінулі пасля катастрофы, плошча забруджвання стронцыем скарацілася амаль у два разы, цэзіем — у 1,7 раза.**

«З 1986-га да 2016 года з забруджаных зон выведзена 1485 населеных пунктаў, ці 40 працэнтаў. Спіс перагледжваецца раз на пяць гадоў і карэктуецца пасля абавязковага ўдакладняючага радыялагічнага абследавання дадзеных населеных пунктаў. Больш за ўсё населеных пунктаў — 1813 (ці 83 працэнты) — знаходзіцца ў зоне з перыядычным радыяцыйным кантролем. З 1986-га да 2018 года колькасць насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі забруджвання, у тым ліку і за кошт пераходу часткі населеных пунктаў у больш чыстыя зоны, зменшылася на 1 мільён 87 тысяч (амаль на палову) і на 1 студзеня 2019 года складае 1 мільён 112 тысяч чалавек», — паведаміў падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Пётр НІКАЛАЕНКА.**

Скарачэнне колькасці населеных пунктаў, якія адносяцца да зоны забруджвання, будзе адбывацца і надалей. Па прагнозах да 2020 года іх будзе 2050, да 2050 года — 1218.

Да тэрыторыі радыяцыйнага забруджвання адносяцца 19 раёнаў Гомельскай вобласці, 13 — Магілёўскай, 4 — Брэсцкай, 10 — Мінскай і 3 — Гродзенскай.

Як паведаміў Пётр Нікалаенка, у межах дзяржпраграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС за 2016—2020 гады плануецца выкарыстаць 2 мільярды 510 мільёнаў рублёў. Большасць з гэтых сродкаў пойдзе на сацыяльную абарону, медыцынскае забеспячэнне і аздараўленне насельніцтва. Так, сёння на дыспансерным уліку знаходзіцца каля паўтара мільёна жыхароў праблемных тэрыторый. Летась медагляд прайшлі 1 мільён 478 тысяч чалавек (гэта 98,5 %). Санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленнне прайшлі ў 2018 годзе 97,7 тысячы грамадзян, у тым ліку 87,6 тысячы дзяцей. Выдаткі на гэтыя мэты склалі 86,3 мільёна рублёў.

Пастулова праца з пацярпелымі тэрыторыямі мяняецца, назіраецца пераход ад рэабілітацыйных мерапрыемстваў да развіцця сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў. Ужо многа зроблена для добраўпарадкавання населеных пунктаў, яны газіфікуюцца, пракладаюцца водаправодныя сеткі, будуюцца дарогі, закупляецца транспарт. Узводзяцца і рамантуюцца аб'екты аховы здароўя і адукацыі. Так, у горадзе Ветка праведзены капітальны рамонт гімназіі і ўведзены ў эксплуатацыю басейны. Брагінская бальніца сёння аснашчана добрым абсталяваннем, у Хойніках і іншых гарадах будуюцца школы, жыллё.

Для замацавання спецыялістаў на забруджаных тэрыторыях існуе цэлая праграма. Дзякуючы мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў сёння няма вострага дэфіцыту ўрачоў, настаўнікаў, сельгасработнікаў.

Пад радыяцыйнае забруджванне падпадала каля 23 працэнтаў ляснога фонду Беларусі. З 1986-га да 2019 года плошча лясоў, забруджаных цэзіем, скарацілася на 420 тысяч гектараў. Сярод асноўных ахоўных мерапрыемстваў — лесааднаўленне і лесаразвядзенне, ахова лясоў ад пажараў (ствараюцца спецыяльныя засцерагальныя палосы, устанаўліваюцца сродкі назірання, тэхнічна аснашчаюцца пажарныя станцыі).

У зонах адчужэння і адсялення знаходзяцца 250 «асірацелых» населеных пунктаў з рэшткамі пабудоў і збудаванняў, 127 помнікаў воінам, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, і 270 могілак.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# АСВАЕННЕ

## Што паглядзець падчас экскурсіі



**У канцы лістапада беларуская зона адчужэння — а дакладней, пэўныя тэрыторыі Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка (ПДРЭЗ) — афіцыйна адкрылася для турыстаў. Новыя для Беларусі турыстычныя маршруты ўжо апрабавалі шаснаццаць экскурсійных груп, кожная — ад пяці чалавек.**

Карэспандэнты «Звязды» таксама адправіліся ў зону адчужэння, каб на свае вочы пабачыць, чым прываблiваюць гэтыя тэрыторыі, а таксама даведацца, ці небяспечныя такія «вылазкі» і колькі яны каштуюць.

### Маршруты пастаянна дапрацоўваюцца

Пасля катастрофы на ЧАЭС больш як 22 тысячы жыхароў найбліжэйшых беларускіх вёсак пакінулі свае дамы. Тут можна паразважаць пра тое, як адна страшная падзея можа спыніць час. Практычна ў кожным закінутым будынку засталіся некранутымі бытавыя прадметы, карты, музычныя інструменты. Напрыклад, у сэрцы запаведніка — вёсцы Пагоннае — мёртва стаяць Дом культуры з лозунгам «Няхай жыве камунізм — светлая будучыня чалавецтва!», школа, крама і інш.

— Цікавасць да наведвання зоны існавала заўсёды. І забаронамі мы гэтага не вырашым. Тым больш ва Украіне ўжо з дзясятак гадоў праводзяць экскурсіі. Усё роўна, канешне, залазяць так званыя сталкеры (тыя, хто наведвае і даследуе закінутыя месцы. — **Рэд.**). Гэта хавае ў сабе небяспеку. Па-першае, можна напаткаць дзікіх звяроў, а па-другое, гэтыя людзі не ведаюць, дзе які ўзровень радыяцыі. А ёсць і законапаслухмяныя людзі, якія хацелі паглядзець, але не маглі. На радаўнічныя выхадныя трапіць у зону адчужэння можна без спецыяльнага пропуска, толькі адзначыўшыся на КПП. Летась да нас прыехала каля чатырнаццаці тысяч чалавек. Таму мы вырашылі ўзаконіць наведванне і наладзіць бяспечныя маршруты, — расказаў **Пётр НІКАЛАЕНКА, намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

**ДАРЭЧЫ.** Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік — гэта вялікая гаспадарка з асаблівым парадкам. Адказнасць за незаконнае пранікненне сюды імгненна можа перарасці з адміністрацыйнай у крымінальную.

Паводле слоў спецыяліста, першапачаткова ў запаведніку намечаны з дзясятак маршрутаў, але цяпер абкатаныя два. Першы праходзіць праз вёскі Дронькі і Пагоннае. Другі — праз Выграбную Слабаду і пасёлак Сонечны. Маршруты, дзякуючы пажаданням турыстаў, пастаянна дапрацоўваюцца. Падчас экскурсіі гід расказвае пра мясціны, людзі могуць паглядзець на адселеныя вёскі, зайсці ў пустыя хаты.

### Час у гэтых мясцінах нібы спыніўся

Наша экскурсія пачынаецца з праходжання КПП «Бабчын». Тут мы сядаем у спецыяльны аўтобус (допуск свайго транспарту забаронены), дзе супрацоўнік запаведніка праз гучную сувязь паведамляе пра мясцовасць.

Па дарозе ў Дронькі наведваем спецыяльную ферму, дзе разводзяць коней. Тут можна пагладзіць маленькіх жарабят і адчуць сябе ў жывой сельскай мясцовасці.

Маршрут да выселенай вёскі пралягае праз густы лес. Нам пашчасціла пабачыць з аўтобуса лася і зайца — тую маленькую частку біяразнастайнасці, якая існуе ў запаведніку. Дарэчы, у зімовы час тут можна наведаць і зубрагадавальнік.

Першы пункт маршруту — вёска Дронькі — згадваецца ў пісьмовых крыніцах з XVIII стагоддзя! Да катастрофы тут жылі 232 чалавекі, якія вымушаныя былі пакінуць свае хаты 4 мая 1986 года.

Тут захаваліся будынкі былых жылых дамоў, школы і крамы. Унутры кожнага збудавання — свае напаміны пра мінулае: старыя вучнёўскія сшыткі, абрыўкі часопісаў і газет, туфлікі і раскіданы посуд. Мёртвая цішыня і пустата гэтых мясцін мімаволі навявае экзістэнцыяльныя думкі і выклікае ўзрушальныя пачуцці: усяго адзін дзень можа кардынальна і назаўсёды змяніць тысячы жыццяў.

Другая вёска — Пагоннае — перажыла спачатку адну трагедыю: падчас Вялікай Айчыннай вайны яна была цалкам спаленая. Жыхары пабудавалі хаты, Дом культуры, школу, дзіцячы садок, бібліятэку, бальніцу і г. д., але не на доўгі век. Вёска была цэнтрам саўгаса «Перамога сацыялізму». Да чарнобыльскай катастрофы тут жылі і працавалі 1053 чалавекі.

На дошцы для аб'яў каля Дома культуры вісіць падыржавелы партрэт Пушкіна. З якога часу — невядома. Унутры будынка, дзе ў аглушальнай цішыні раз-пораз чуеш, як падаюць паслядажджавыя кропелькі з дзіравай столі, на велізарнай для сельскай мясцовасці сцэне валяюцца расцяжкі, што віншуюць з Першамаем і прадказваюць вялікую камуністычную будучыню...

Пасля Пагоннага турысты першага маршруту едуць у вёску Красноселле,

# ЧАС ДЛЯ

## Як сёння спецыялісты сочаць за радыяцыйным фонам у краіне,

**Праз 30 гадоў пасля чарнобыльскай катастрофы радыяцыйнае становішча на забруджаных тэрыторыях ужо не можа лічыцца аварыйным. Паступова — за кошт натуральных працэсаў і дзейнасці чалавека — дозы апрамянення зніжаюцца. Нягледзячы на гэта, за радыяцыйным фонам пастаянна назіраюць спецыялісты.**

### За фонам сочаць кругласутачна

— У нашай краіне радыяцыйныя назіранні праводзяцца з 1963 года, — расказаў **Міхаіл КАВАЛЕНКА, начальнік службы радыяцыйнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыяцыйнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.** — Але штуршком для развіцця сеткі радыяцыйнага маніторынгу стала катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.

Радыяцыйны маніторынг — адзін з кампанентаў Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя. Ён праводзіцца для назірання за прыродным радыяцыйным фонам; радыяцыйным фонам у раёнах уздзеяння патэнцыйных крыніц радыеактыўнага забруджвання; радыеактыўным забруджваннем атмасфернага паветра, глебы, паверхневых і падземных вод на тэрыторыях, што падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на ЧАЭС.

Сёння сетка радыяцыйнага маніторынгу атмасфернага паветра складаецца з 41 стацыянарнага пункта назіранняў. У краіне таксама дзейнічае шэсць пунктаў маніторынгу паверхневых вод, на сямі пунктах праводзіцца іх трансгранічны маніторынг. На 39 пунктах назіранняў кантралюецца колькасць радыенуклідаў у глебах.

Акрамя дыскрэтных пунктаў назірання, у Беларусі арганізавана і сетка аўтаматызаваных пунктаў радыяцыйнага маніторынгу: у анлайн-рэжыме функцыянуе пяць аўтаматычных сістэм кантролю радыяцыйнага становішча, яны прадугледжаны для падтрымкі і прыняцця рашэнняў у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі радыяцыйнага характару. У зоне ўплыву АЭС сумежных дзяржаў дзейнічаюць 22 пункты вымярэння. 10 аўтаматычных пунктаў назіранняў размешчаны ў зоне будаўніцтва БелАЭС, яшчэ 10 такіх пунктаў павінна пабудаваць арганізацыя, якая будзе эксплуатаваць атамную станцыю. Дзве сістэмы дапоўняць адна адну, інфармацыя з іх будзе накіроўвацца ў рэспубліканскі цэнтр МНС і стане даступнай для спецыялістаў.

Тэлесеткі

# Раскажу вам навіну...

Зрабіць гэта на шырокую аўдыторыю цяпер можа кожны ахвотны — з дапамогай мабільнай праграмы «Навіны АТН». Сэрвіс, які працуе на платформах Android і iOS, прапануе стужку свежых інфармацыйных відэасюжэтаў, у тым ліку эксклюзіўных і дадатковых, якіх няма ў тэлевізійным фармаце, дапамагае хутка знайсці і паглядзець усе выпускі праектаў Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі, але таксама задаць свае пытанні на гарачай лініі ці анлайн-канферэнцыі, прапанаваць уласную навіну.

Як адзначаюць спецыялісты медыяхолдынга, у праграме можна як праглядаць навіны, што прапанаваны рэдакцыяй, так і настроіць раздзел «Мае навіны» — сістэму апавяшчэння пра важныя падзеі, якія цікавяць асабіста вас. А тыя, хто стаў відавочцам важных падзей, змогуць расказаць пра іх іншым карыстальнікам, змясціўшы ўласны відэаролік з кароткім тэкставым каментарыем. Дарэчы, журналісты АТН будуць выкарыстоўваць такія матэрыялы і ў эфіры. «Мы стварылі гэтую праграму, каб гледачы пры наяўнасці інтэрнэту маглі глядзець навіны і праекты АТН у любым месцы і ў любы час, — гаворыць **кіраўнік АТН Сяргей ХАМЯНТОЎСКІ.** — Безумоўна, каб адпавядаць патрэбам часу, надалей будзем працаваць над удасканальваннем функцыяналу».

Неўзабаве будуць запушчаны і новыя мабільныя праграмы — «Беларусь 5» і «Культурны каляндар».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

На хвалі

## Абвешчаны пераможцы конкурсу спартыўных сэлфі

Міжнароднае радыё «Беларусь» і Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года падвялі вынікі конкурсу «Маё прывітанне II Еўрапейскім гульням». У яго межах арганізатары атрымалі каля 170 фотаздымкаў з 26 краін свету, ад Алжыра і Бразіліі да Таджыкістана і Фінляндыі, а спартыўныя сэлфі фіналістаў убачылі і ацанілі больш як 32 тысячы наведвальнікаў сайта radiobelarus.by.

Першае месца і ганаровы дыплом, а таксама запрашальнікі на цырымоніі адкрыцця і закрыцця міжнароднага спартыўнага форуму і ў дадатак камплект парадна-спартыўнай экіпіроўкі нацыянальнай каманды Беларусі атрымае ўдзельнік з Германіі Дзітмар Вольф. Другое месца ў конкурсе заняла слухачка з Расіі Алёна Марчанка, трэцяе — беларус Іван Ліплянскі. Абодва яны таксама атрымаюць запрашальнікі на мерапрыемствы II Еўрапейскіх гульняў і камплекты парадна-спартыўнай экіпіроўкі. Цырымонія ўзнагароджвання пройдзе ў маі.

Улічваючы вялікую цікавасць да конкурсу і мноства атрыманых работ, арганізатары вырашылі ўручыць заахвочвальныя прызы — промапрадукцыю з сімволікай мультыспартыўнага форуму — аўтарам дзесяці работ, што ўвайшлі ў дзясятку найлепшых і набралі больш за ўсё галасоў у інтэрнэт-галасаванні. Сярод прызёраў — удзельнікі з Беларусі, Расіі, Польшчы, Германіі, Кітая і Індыі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 87

З 4 да 14 красавіка ў Мінску (Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках) праходзілі чэмпіянаты Беларусі (вышэйшая ліга) па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. Абодва турніры праходзілі па кругавой сістэме пры 12 удзельніках. Чэмпіёнам Беларусі сярод мужчын стаў міжнародны гросмайстар Яўген Ватуцін — 17 ачкоў з 22 магчымых. Другім фінішаваў міжнародны гросмайстар Аляксандр Булатаў — 16 ачкоў, трэцяе месца ў міжнароднага майстра Аляксея Куніцы — 15 ачкоў. Чэмпіёнкай краіны сярод жанчын стала міжнародны гросмайстар Вольга Федаровіч, якая набрала 18 ачкоў з 22 магчымых. Сярэбраны медаль выйграла майстар В. Нікалаева — 16 ачкоў, бронза ў міжнароднага майстра Дар'і Федаровіч — 15 ачкоў.

Паглядзіце цікавыя фрагменты гульні.

**№ 33** В. Белая — В. Нікалаева

**Белыя простыя шашкі:** 24, 26, 30, 31, 34, 35, 36, 38, 43 (9)

**Чорныя простыя шашкі:** 3, 12, 13, 14, 17, 18, 22, 27, 28 (9)

1.4339? чорныя з дапамогай ахвяры здзейснілі прарыў 1...2732! 2.3827 2833 3.3928 2233 і ў далейшым перамаглі.

**№ 34** У. Валюк — М. Васько

**Белыя простыя шашкі:** 17, 29, 30, 35, 39, 47, 49 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 2, 6, 9, 14, 16, 19, 37 (7)

Белыя рэалізавалі сваю перавагу з дапамогай камбінацыі. 1.3025! Двайная пагроза прарыву і камбінацыі, на якую і трапілі чорныя 1...0207 2.4742 3748 3.3934 4830 4.3504+

На дыяграме № 35 мініяцюра нашага чытача В. Шульгі.

**№ 35** В. Шульга (Мінск)

**Белыя простыя шашкі:** b4, b6, c5, d4, e3 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, d8, e7, f6, g5, h8 (6)



Наступная пазіцыя складзена вядучым аддзела ў бразільскія шашкі.

**№ 36**

**Белыя простыя шашкі:** b6, c5, c7, d6, e3 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a5, a7, d4, f6, g3, h6 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 86 ад 12.04.2019.

№ 29 1...h6-g5 2. f4xh6 f6-e5 3. d4xd8 c5-b4 4. a3xc5 b6xb2 5. c1xa3 f8-g7 6. h6xf8 b8-c7 7. d8xb6 a7xc5 8. f8xb4 a5xh4 і найбольш магчымы зыход — нічыя.

№ 30 1. gf4 eg5 2. cd6 ae7 3. ab6 ca5 4. ab4 ac3 5. ed2 ce1 6. gf2 eg3 7. hf4.+

№ 31 b6, c5, c7, g7, g3, f2 (g7), e3, e3, f4,+..

№ 32 25-20, 21, 11, 13, 14, 42,+.

Правільныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялёны Бор, Івацэвіцкі р-н), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н), В. Бандарык (Мінскі р-н).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь Варушыла, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# «Дазваляю ў сіні колер. Вялікае прывітанне!»

## 55 гадоў таму здымалася камедыя «Зайчык»

...Тэатральны грымёр Леў Зайчык цалкам адпавядае свайму забаўнаму прозвішчу: ён добры і шчыры, але сарамлівы і нерашучы аж да баязлівасці чалавек. Абвострана перажываючы хамства і несправядлівасць, ён не можа супрацьстаяць ні фанабэрыстаму галоўнаму рэжысёру, ні нахабнаму бюракрату, ні нават вулічнаму хулігану. Дый з актрысай-пачаткоўкай Наташай, якой сімпатызуе Зайчык, стасункі не складваюцца — ажно пакуль дзяўчына, якая ўсё разумее, не раіць закаханаму маладому чалавеку звярнуцца да псіхолага, каб умацаваць упэўненасць у сабе. І трэба ж такому здарыцца, што ў паліклініцы Зайчык выпадкова чуе ад урача фразу: «Жыць гэтаму зайчыку засталося не больш за месяц». Гаворка, насамрэч, ішла пра зайца, гадаванца юнатаў, што падхапіў нейкую сваю заечую хваробу, — але ж малады чалавек пра гэта нават не здагадваецца, і таму вырашыў пражыць адмераны лёсам час з годнасцю і на карысць іншым, перамагчы нахабнікаў і чынуш, ды абавязкова прызнацца Наташы ў сваіх пачуццях...



«Зайчык» — першая поўнаметражная работа знакамітага акцёра Леаніда Быкава ў якасці рэжысёра. Жанр фільма сам Леанід Фёдаравіч вызначаў як «эксцэнтрычная камедыя з пэўным сатырычным зарадам», у якой герой сутыкаецца з «рэальна пазнавальнымі людзьмі, рэальна пазнавальнымі ўстановамі, і, што істотна, з рэальнымі з'явамі». Галоўнага героя, які прайшоў шлях пераўвасаблення з Зайчыка ў Ільва, сыграў сам Леанід Быкаў — і працягнуў гэтую традыцыю ў наступных сваіх карцінах «У бой ідуць адны «старыя» і «Аты-баты, ішлі салдаты». Акрамя таго, акцёрскі састаў фільма ўтрымлівае цэлы россып прозвішчаў цудоўных камедыйных артыстаў, тагачасных зорак экрана: Сяргей Філіпаў, Георгій Віцын, Ігар Дзмітрыеў, Аляксей Смірноў, Глікерыя Багданава-Часнакова ды іншыя.



Але вынік агульнай работы, мякка кажучы, не спадабаўся. Кіраўніцтва студыі «Ленфільм» успрыняло рэжысёрскі дэбют Быкава як правал, палічыўшы камедыю сатырычнай, але «нясмешнай», драматургію — слабай, героя — невыразным, і вырашыла больш да рэжысуры акцёра не дапускаць. З адчувальным халадком сустрэлі фільм і крытыкі, а ў год прэм'еры «Зайчыка» хоць і паглядзелі 25 мільёнаў чалавек, але асаблівага ажыятажу сярод публікі таксама не назіралася. Гэтую рэакцыю Быкаў сустрэў вельмі балюча і на некалькі гадоў наогул знік з кіно, перажываючы творчы крызіс і адмовіўшыся ад мноства прапаноў. І ўсё ж «Зайчык» прайшоў выпрабаванне часам — і, нягледзячы на сваю вонкавую наіўнасць і непасрэднасць, не страціў актуальнасці. Сучасныя крытыкі расстаўляюць акцэнты ўжо інакш: так, фільм нясмешны, але ён і не меў задачы проста насмяшыць. Гэта «невясёлая камедыя» атрымалася, насамрэч, вельмі душэўнай, добрай і жыццесцвярджальнай, а галоўны герой па-ранейшаму выклікае ў гледачоў падтрымку і спачуванне.

Успомніць наноў фільм і вырашыць для сябе, ці варты «Зайчык» пераацэнкі, можна на наступным тыдні — дзякуючы тэлеканалу «Беларусь 3», які пакажа камедыю **30 красавіка.**

### Сказана!

- *«Навошта ж так хваляваццa? Глядзіце, ужо прыйшоў першы глядач. Магчыма, прыйдуць і астатнія».*
- *«Любіце мастацтва ў сабе, а не сябе ў мастацтве, як гаварыў Станіслаўскі. А калі што — выхад прама!»*
- *«Я ў твае гады шасцёра дзяцей меў. Сям'я, дзеці, непрыемнасці, скандалы — адчуваеш, што жывеш».*
- *«Граф! Там, ля агарода, мы затравілі рысака».*
- *«Так-так... Ну-ну... Само сабой... Дазваляю... Вялікае прывітанне!»*
- *«Хто крычыць? Дырэктар. І яшчэ адна... грамадскасць».*
- *«Кім быў гэты Зайчык? Ён заўжды плаціў за кватэру, здаваў бялізну на мыццё. І ўсё?»*



### За кадрам

**Менавіта на гэтых здымках пазнаёміліся акцёры-франтавікі Леанід Быкаў і Аляксей Смірноў, што вылілася не толькі ў моцнае сяброўства, але і ў плённае творчае супрацоўніцтва.**

**Артысты Багданава-Часнакова і Дзмітрыеў сыгралі персанажаў, якіх звалі, як і саміх акцёраў: Глікерыя Васільеўна і Ігар Барысавіч.**

**Праз 50 гадоў аматары кіно зрабілі ролік, як выглядаюць сёння вуліцы Санкт-Пецярбурга (у час здымак — яшчэ Ленінграда), на якіх працавала здымачная група — Варшаўская, Новасібірская, Омская... А вось чыгуначная лінія Корпуснае шасэ—Шасэйная, дзе здымаўся заключны эпізод карціны, да нашых дзён не захавалася — яе дэманціравалі ўжо напрыканцы 1960-х.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Кароткае слова «не» (16+).**
**12.45, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Учора. Сёння. Назаўсёды...» 1—4-я серыі (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нашы» (6+).
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.40** «Арэна».
**0.40** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Даравацъ» (16+).**
**10.10** «Капейка ў капейку» (12+).
**10.45** «Свет навыварат. Непал» (16+).
**11.55** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**12.45 Анімацыйны фільм «Монстры супраць прышэльцаў» (12+).**
**14.15 Маст. фільм «Калі спяваюць анёлы» (12+).**
**15.45 Фантастыка «Вартавыя Галактыкі» (12+).**
**17.45** «Веру не веру» (16+).
**19.15** «Суперлато».
**21.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**22.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**23.00** «Ідзі сюды і танцуй».
**23.05 Серыял «Жаночы доктар» (16+).**
**23.55** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.40, 12.25** «Беларуская кухня». Качка з дранікамі.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.25, 16.30 «Няскончаная аповесць». Маст. фільм (12+).**
**11.05** «Архітэктура Беларусі».
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Васіль Шукшын (12+).
**12.50** «Беларусь як песня». Тамара Раеўская.
**13.15** «Наперад у мінулае».
**13.45** «Навукаманія» (6+).
**14.10, 21.45 «Каліна чырвоная». Драма (16+) [СЦ].**
**15.55** «Люблю і памятаю». Народны артыст БССР, народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі.
**18.10** «Легенды музыкі». «Брэменскія музыканты» (12+).
**18.35** «Что я люблю, во что я верю...» Юбілейны канцэрт народнага артыста Беларусі Валянціна Дудкевіча.
**19.50** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Сяргей Пісарэнка.
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**7.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. БК «Ніжні Ноўгарад» — «Цмокі-Мінск».
**8.45** Вынікі тыдня.
**9.30** Вялікі спорт.
**10.15** Гульні «навыраст».
**10.45** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Баку.
**12.50, 19.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Першы дывізіён. Літва — Беларусь.
**15.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Бернлі» — «Манчэстэр Сіці».
**16.50** Хакей. Чэмпіянат свету. Першы дывізіён. Славенія — Казахстан. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Арсенал». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Два колеры страсці» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Спроба Веры» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** Ток-шоу «Наша жыццё».
**22.10 Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (12+).**
**0.10 Серыял «Абдымаючы неба» (16+).**

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**12.40, 23.45** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 0.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.40** «Як устроены Сусвет» (16+).
**15.35, 16.50 «Пры загадкавых абставінах». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічная падрабязнасці».
**20.30 «Жукаў». Серыял (16+).**
**22.15** «Глядзець усім!» (16+)
**0.25** «Мінтранс» (16+).

## МІР

**6.00 Серыял «Адналюб» (16+).**
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15, 16.15 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў» (12+).**
**17.05 Маст. фільм «Формула каханння» (0+).**
**19.15 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры» (0+).**
**0.45 Маст. фільм «Ганг, твае вады замуціліся» (16+).**
**4.00 Маст. фільм «Пятнаццацігадовы капітан» (12+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.45** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30 Серыял «Жанчыны на мяжы» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.15** «Спецыяльны рэпартаж».
**15.35** «Лёс чалавека» (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40, 23.10 Маст. фільм «Суседзі. Новы сезон» (12+).**
**0.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.30** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.10** «Мальцава» (12+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50** «Доктар Святло» (16+).
**9.40** «За гранню» (16+).
**10.20** «Чакай мяне» (12+).
**11.05** «Крутая гісторыя» (12+).
**11.55, 23.05** Пракурорская праверка (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Нашы» (12+).
**14.20, 16.20 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**17.10** «ДНК» (16+).
**18.10** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**19.35** Сёння. Галоўнае.
**19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**20.45 Серыял «Растоў» (16+).**
**22.40** «НЗ.by».

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.05, 21.05, 1.00** «Надвор'е».
**7.05** М/с «Русалачка».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Камедыя «Марлі і я» (12+).**
**9.30** Дак. серыял «Вялікі скачок».
**10.00, 19.10 Серыял «Марчэла» (16+).**
**10.50** Дак. серыял «Падарожжа па гарадах з гісторыяй» (12+).
**11.15 Драма «Апакаліпсіс» (16+).**
**13.30, 20.05 Серыял «Смяротная зброя» (16+).**
**14.15 Камедыя «Вясёлы Вялікдзень» (12+).**
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** Дак. фільм «Дзікая прырода Расіі».
**17.30 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Аднойчы ў Амерыцы» (16+).**



## ВТБ

**6.05, 4.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**6.50, 5.00** «Лаві момант» (16+).
**7.30, 3.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.20, 2.45** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.15** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.35** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.40** «Наш рамонт» (16+).
**11.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.20** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**14.00** Серыял «Вялікая гульня» (16+).
**16.00** Баявік «Штурм Белага дома» (16+).



**18.35** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.40** Камедыя «Таксі» (12+).
**22.20** Камедыя «Таксі-2» (12+).
**0.00** Камедыя «Канец свету — 2013: апакаліпсіс па-галівудску» (18+).
**1.55** «Кіно ў дэталях» (16+).
**1.15** «Хачу верыць!» (16+)

## Культура

**6.30** «Сіта і Рама». Серыял (СЦ).
**8.50** «Звычайны канцэрт».
**9.20** «Мы — грамацеі!»
**10.00** «Ганна Карэніна». Маст. фільм (СЦ) (0+).
**12.20** «Гісторыя рускай ежы». Дак. серыял (СЦ).
**12.55** «Сабрына». Маст. фільм (12+).
**14.45** «Гафманіяда». М/ф (12+).



**16.00** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**16.15, 1.30** «Дынастыі». Дак. фільм (СЦ).
**17.10** «...Трэба жыць на свеце ярка!» Вечар Мікалая Дабранравава.
**19.25** «Старшыня». Маст. фільм (СЦ) (12+).
**22.05** «Бэн Гур». Маст. фільм (0+).
**2.20** «Кот у ботах», «Ікар і мудрацы». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1965-ы. 2-я частка. 2009 год (16+).
**7.05** «Вакол смеху». «Вясновы баль гумарыстаў». 1984 год (12+).
**8.35, 9.45, 11.00, 13.25, 17.05, 23.20, 2.15, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
**13.50** «Аншлаг! Аншлаг!» 1989 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2010 год (16+).
**16.00** Тэлеспектакль «Залатая рыбка». 1985 год (12+).
**18.00** «Кінапанарама» з Эльдарам Разанавым: «Майстры савецкага кіно». 1982 год (12+).
**20.00** «Песня-80» (12+).
**22.00** «Вакол смеху». 1982 год (12+).
**0.00** Маст. фільм «Ганна Пятроўна» (16+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).

## EuroSport 1

**0.30** Ралі. Канарскія астравы.
**1.00, 4.00, 6.00, 9.30, 13.30** Веласпорт. «Тур Рамандыі».
**1.45, 5.00, 10.45** Веласпорт. «Тур Ёркшыра».
**2.30, 7.00, 12.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**12.00, 19.00** Аўтагонкі. WTCR.
**16.15, 20.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Фінал.
**19.30** Конны спорт. Global Champions Tour.

## Кінакамедыя

**0.35** Ультраамерыканцы (18+).
**2.35** Вялікі салдат (16+).
**4.40** Кароль вечарынак (16+).
**6.30** Шэф (12+).
**8.05** Васабі (16+).
**9.55** Дзікая штучка (16+).
**11.50** Гудзонскі ястраб (16+).
**13.45** Прыкінься маім мужам (16+).
**15.45** Без тармазоў (16+).
**17.30** Таксі (16+).
**19.10** Таксі-2 (16+).
**20.55** Таксі-3 (16+).
**22.30** Таксі-4 (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.55** Калекцыя «Беларусьфільма». «Дунечка». Маст. фільм.
**9.40, 5.30** «Заўтра сёння» (12+).
**10.10** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**10.55** «Глядзі сам» (12+).
**11.20, 1.20** «Завяшчанне прынцэсы». Серыял (12+).
**15.00, 4.20** «Ён і яна» (16+).
**16.25** «Мой найлепшы вораг». Маст. фільм (12+).
**20.15** «Без падману» (16+).
**21.10** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**21.45** «Сахара». Баявік (12+).
**23.55** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

## ТБ1000

**6.10** Назад у будучыню I (12+).
**8.30** Абяцанне (16+).
**11.05** Пяты элемент (12+).



**13.30** Пакой страху (16+).
**15.35** Сямейка Крудс (6+).
**17.25** Код да Вінчы (16+).
**20.10** Анёлы і Дэманы (16+).
**22.45** Кінг Конг (16+).
**2.10** Джулі і Джулія: гатуем шчасце па рэцэпце (12+).
**4.10** Елізавета (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**8.05** Прыцягненне (12+).
**10.25** Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
**13.00** Якая цудоўная гульня (12+).
**14.45** Сем вячэр (12+).
**16.30** Добры хлопчык (12+).
**18.20** За гранню рэальнасці (12+).
**20.20** Кандагар (16+).
**22.25** Усё ці нічога (16+).
**0.15** Міфы (16+).
**2.05** Я худзею (16+).



**3.55** Ваўкадаў з роду Шэрых Сабак (16+).

## National Geographic

**6.00, 10.00** Дзікая прырода Расіі (16+).
**9.15** У пошуках спадчыны (16+).
**11.35** Закінутыя скарбы Егіпта (16+).
**13.55, 17.15, 0.40, 3.30** Геній: Пікаса (16+).
**18.10, 21.25** Варожая планета (16+).
**19.50, 23.05** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога (16+).
**4.25** Асушыць акіян (16+).
**5.15** Аўта-SOS (16+).

## Discovery

**8.00** Як гэта ўстроена? (12+)
**9.20, 18.30** Як гэта зроблена? (12+)
**10.15** Злачынцы Трэцяга рэйха (16+).
**11.10** Залатая ліхаманка (16+).
**12.05** Невядомая экспедыцыя (16+).
**13.00, 3.40** Уладары розуму (12+).
**13.55, 23.05** Музейныя тайны (12+).
**14.50, 2.45** Голыя і напалоханыя (16+).
**15.45, 4.35** Утыльшчыкі (12+).
**17.35** Як гэта ўстроена? (12+)
**19.25** Свяшчэнная сталь (16+).
**0.00, 7.10** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**0.55** Самагоншчыкі (18+).
**1.50** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**6.20** Мега-піт-стопы (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 2.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.40** «Зона Х» (16+).
**9.10, 12.10 Меладрама «Замкнёнае кола». 1—4-я серыі (16+).**
**13.05** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25 Меладрама «Шалёнае каханне» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**18.35, 19.20 Меладрама «Прытворшчыкі» (12+).**
**21.00** «Панарама».
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**22.10 Меладрама «Палёт матылька». 1—4-я серыі (12+).**
**1.25** «Сфера інтарэсаў».
**2.20** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 17.55** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.50 Серыял «Зразумець. Даравацъ» (16+).**
**9.40, 20.20 Серыял «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].**
**10.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.15, 18.00 Серыял «Знішчальнікі» (12+).**
**13.05 Серыял «Жаночы доктар» (16+).**
**14.00, 17.25** «Калі мы дома-2». Скетчкам (16+).
**14.50** «Да пабачэння» (16+).
**15.40** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.30 Серыял «Цэнтральная бальніца» (16+).**
**20.55** «Тата папаў» (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**22.10 Камедыя «Карацей» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.40, 12.25** «Беларуская кухня». Мяса ў цэсце.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.30, 17.40 «Зайчык». Камедыя (12+).**
**9.55** «Выйсце ёсць». Уладзімір Цэслер (12+).
**10.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Алег Даль (12+).
**12.50** «Беларусь як песня». Галіна Галенда.
**13.15** «Легенды музыкі». «Брэменскія музыканты» (12+).
**13.40, 19.05** «Вызваленне». «Брацілаўска-Брноўская наступальная аперацыя» (12+).
**14.10, 21.45 «Залатая міна». Дэтэктыў (12+).**
**16.25** Міжнародны фестываль «Jazz in Minsk — 2018».
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**7.55** Хакей. Чэмпіянат свету. Першы дывізіён. Літва — Беларусь.
**9.55** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Баку.
**11.35** Спорт-мікс.
**11.45** Хакей. Чэмпіянат свету. Першы дывізіён. Славенія — Казахстан.
**13.40** Тэніс. WTA. Фіналы.
**15.50** Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Відэачасопіс.
**16.20** Хакей. Чэмпіянат свету. Першы дывізіён. Беларусь — Венгрыя. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**18.45** Футбол. Кубак Беларусі. 1/2 фіналу. Матч у адказ. «Дынама-Мінск» — ФК «Віцебск». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.50** Матч-пойнт.
**21.20** Гульні.by.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/2 фіналу. Першы матч. «Тотэнхэм» — «Аякс». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.55** Спорт-кадр.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.05, 8.05** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Сёння 30 красавіка. Дзень пачынаецца» (6+).
**9.50** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «Два колеры страсці» (16+).**
**12.20, 13.10 Серыял «Спроба Веры» (16+).**
**14.40** «Давай пажэнімся!» (16+)
**15.35, 16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.05** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Па законах ваеннага часу-2» (12+).**
**23.10 Серыял «Абдымаючы неба» (16+).**

## СТБ

**5.30** «Цэнтральны рэгіён».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Мінштына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.10, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 20.30** «Жукаў». Серыял (16+).
**12.35, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 0.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.40** «Як устроены Сусвет» (16+).
**15.30, 16.50 «Пры загадкавых абставінах». Серыял (16+).**
**19.55, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.15** «Глядзець усім!» (16+)
**1.15** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00** М/ф (0+).
**6.25 Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).**
**8.20 Маст. фільм «Казка пра страчаны час» (0+).**
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры» (0+).**
**15.40, 16.15 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (12+).**
**17.40, 19.15 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (12+).**
**19.55 Маст. фільм «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя» (12+).**
**22.45 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў» (12+).**
**4.30 Маст. фільм «Тонкія ніткі кахання» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25, 14.25 Маст. фільм «Клубнічны рай» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.40** «Лёс чалавека» (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40, 23.10 Маст. фільм «Суседзі. Новы сезон» (12+).**
**0.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.30** «Гарады Беларусі» (6+).
**7.10** «Мальцава» (12+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50, 10.20 Серыял «Ляснік» (16+).**
**9.40, 22.40** «НЗ.by».
**11.55, 23.05** Пракурорская праверка (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Нашы» (12+).
**14.20, 16.20 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**17.10** «ДНК» (16+).
**18.10** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).
**19.35** Сёння. Галоўнае.
**19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**20.45 Серыял «Растоў» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 18.25, 21.05, 1.20** «Надвор'е».
**7.05** М/с «Русалачка».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Драма «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (12+).**
**9.20** Дак. серыял «Вялікі скачок».
**9.45, 18.30 Серыял «Марчэла» (16+).**
**10.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**11.00 Прыгоды «Свет юрскага перыяду» (12+).**
**13.10 Серыял «Смяротная зброя» (16+).**
**13.55 Баявік «Рыцар дня».**
**16.05** «Мультпарад».
**16.40 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**19.20** «Вячэрні квартал — 95».
**20.50** «Вечарыніца» (0+).
**21.10 Драма «Трэнер» (12+).**
**23.30 Прыгоды «Раман з каменем» (16+).**



## ВТБ

**6.05, 4.00** «Лаві момант» (16+).
**6.35, 3.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.30** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**7.50** М/ф «Тры каты» (0+).
**8.15** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**8.50** «Ералаш» (6+).
**9.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.45, 17.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**12.10** Серыял «Вароніны» (12+).
**14.15, 0.50** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.30** Камедыя «Шчаслівы выпадак» (16+).
**19.00** «Дзякуй богу, ты прыйшоў!» (16+).
**20.00** Серыял «Кухня» (16+).
**22.00** Камедыя «Інтуіцыя» (12+).
**23.50, 5.10** Серыял «Мамы чэмпіёнаў» (16+).
**1.45** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

## Культура

**6.30** «Аўтамабіль, скрыпка і сабака Клякса». Маст. фільм (0+).
**8.15** «Трое з Праствакашына». «Канікулы ў Праставакашыне». «Зіма ў Праставакашыне». М/ф.
**9.05** «Тэлескоп».
**9.35** «Залатое цяля». Маст. фільм (СЦ) (0+).
**12.20** «Гісторыя рускай ежы». Дак. серыял (СЦ).
**12.50** «Разумніца Уіл Хантынг». Маст. фільм (16+).
**15.00** Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца імя Ігара Майсеева ў Канцэртнай зале імя П. І. Чайкоўскага.
**16.15, 1.30** «Дынастыі». Дак. фільм (СЦ).
**17.10** 85 гадоў Леаніду Хейфецу. «Блізкае акружэнне».
**18.05** «Рамантыка рамансa». Марку Фрадкіну прысвячаецца.
**19.00** 85 гадоў з дня нараджэння Таццяны Самойлавай. «Астравы» (СЦ).
**19.40** «Ганна Карэніна». Маст. фільм (СЦ) (0+).
**22.00** 90 гадоў з дня нараджэння Одры Хепбёрн. «Сабрына». Маст. фільм (12+).
**23.50** «Мой сярэбраны шар. Одры Хепбёрн».
**0.35** Бобі Макферын. Канцэрт на джазавым фестывалі ў В'енне.
**2.20** «Жыў-быў сабака». «Мартынко». «Падарожжа мурашкі». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Ганна Пятроўна» (16+).
**8.15, 9.45, 11.00, 14.35, 15.45, 17.00, 19.25, 23.00, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1965-ы. 2-я частка. 2009 год (16+).
**13.05** «Вакол смеху». «Вясновы баль гумарыстаў». 1984 год (12+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Сэрцы чатырох» (12+).
**19.50** «Аншлаг! Аншлаг!» 1989 год (12+).
**21.00** «Бый час». 2010 год (16+).
**22.00** Тэлеспектакль «Залатая рыбка». 1985 год (12+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (12+).
**1.05** «Спецыяльна па вашым заказе». 1990 год (12+).
**1.30** Канцэрт «Best of Rock 'n' roll Greats». 2004 год (12+).

## EuroSport 1

**0.00** Ралі. Канарскія астравы.
**0.35, 4.00, 6.00, 9.30** Веласпорт. «Тур Раманды».
**1.30, 5.00, 10.45** Веласпорт. «Тур Ёркшыра».
**2.30, 7.00, 12.00, 16.15, 21.00** Снукер. Чэмпіянат свету.
**15.00** Конны спорт. Global Champions Tour.
**19.30** Аўтагонкі. World Endurance.

## Кінакамедыя

**0.45** Аферысты панявolі (18+).
**2.45** Зялёны шэршань (12+).
**5.05** Неадэкватныя людзі (16+).
**7.05** Амелі (16+).
**9.35** Мноства (16+).
**11.50** Джэй і Маўклівы Боб наносяць удар у адказ (16+).



**13.45** Модная штучка (12+).
**15.45** Агент пад прыкрыццём (12+).
**17.35** Пра Адама (18+).
**19.30** Энцыклапедыя разводаў (16+).
**21.05** Дапамажыце стаць бацькам (16+).
**22.55** Прасунуты (16+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.00** М/ф (6+).
**9.20** «M&S» (12+).
**9.50** «Паехалі» (12+).
**10.20, 0.15** «Перыскоп» (16+).
**10.40** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.35, 2.00** «Аварыя». Серыял (12+).
**15.25** «Хортан». Анімацыйны фільм (6+).
**16.55** «Развітанне» (16+).
**17.50** «Разлучнікі і разлучніцы. Як зводзілі любімых». Дак. фільм (12+).
**18.45, 5.20** «Знак якасці» (16+).
**19.40** «10 самых» (16+).
**20.15** «Забытае злачынства». Маст. фільм (12+).



**22.10** «Эфект-матылька». Фантастыка (16+).
**0.35** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

## ТБ1000

**6.10, 15.20** 12 гадоў рабства (16+).
**8.55** Залатое стагоддзе (16+).
**11.20** Дзявяткі (16+).
**13.20** Голая праўда (16+).
**17.50** Назад у будучыню III (12+).
**20.10** Код да Вінчы (16+).
**22.55** Абяцанне (16+).
**1.25** Ён і Яна (18+).
**3.45** Пяты элемент (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Уцёкі (16+).
**8.55** Жаніх (12+).
**10.55** Герой (12+).
**12.45** На Дэрыбасаўскай добрае надвор'е, або На Брайтан-Біч зноў ідуць дажджы (16+).
**14.45** Нябесны суд (16+).
**16.50, 4.50** Тры волаты і Марскі цар (6+).
**18.25** Сем вячэр (12+).
**20.20** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**22.10** Прыцягненне (12+).
**0.30** Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
**На Радаўніцу, 7 траўня, у Азярычынскай школе (Пухавіцкі раён) абдудзецца прэзентацыя кнігі Змітра і Юрася Санько «Слаўнае сяло Азярычына: свет нашых продкаў».** Пачатак а 15-й гадзіне. У прэзентацыі будуць удзельнічаць аўтары кнігі, запланаваны выступ фальклорнага гурта «Дзядзькі». Кошт кнігі ў дзень прэзентацыі будзе мінімальны: 35 бел. руб. УНП 100008965

**Извещение о проведении 11 мая 2019 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»**

Сведения о продаваемом имуществе:

| Номер предмета торгов | Информация об имуществе | Цена продажи, руб. с НДС | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание гаража (гараж № 32) с инв. № 610/С-44034 общей площадью 46,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001113 площадью 0,0039 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31 | 3888,00 | 388,80 |
| 2 | Здание гаража (гараж № 33) с инв. № 610/С-44033 общей площадью 45,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001114 площадью 0,0031 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31 | 3888,00 | 388,80 |
| 3 | Здание гаража (гараж № 34) с инв. № 610/С-44032 общей площадью 45,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001115 площадью 0,0031 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31 | 3888,00 | 388,80 |
| 4 | Здание гаража (гараж № 35) с инв. № 610/С-1046 общей площадью 49,5 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001116 площадью 0,0029 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31 | 3888,00 | 388,80 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г.Минск, ул. В. Хоружей, 22, к. 1703.

Повторные торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в повторных торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк» БИК BAPBBY2X, г. Минск, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Повторные торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе повторных торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если повторные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 30 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Повторные торги проводятся 11 мая 2019 года в 11:00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, офис 1703.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 27.04.2019 по 04.05.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, e-mail: torgi@agroconsult.by

Организатор аукциона: Tel/Fax (017) 399 66 39, GSM MTS (029) 816-64-46, GSM VEL (044) 540-64-46.

**ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ» сообщает, что 11 мая 2019 г. в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123 г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 состоится внеочередное общее собрание акционеров с повесткой дня:**

1. О приобретении простых (обыкновенных) акций на баланс Открытого акционерного общества «Белтрубопроводстрой» с целью уменьшения уставного фонда общества путем аннулирования части акций в целях сокращения их общего количества 15 000 (Пятнадцать тысяч) по цене 6,75 (шесть рублей 75 копеек) белорусских рублей.
2. Утверждение формы оплаты за приобретаемые акции.
3. Утверждение адреса, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций.
4. Определение даты начала и даты окончания срока предоставления акционерами предложений о продаже акций.
5. Определение даты начала и даты окончания покупки акций.
6. Определение порядка уведомления акционеров – владельцев акций, решение о приобретении которых было принято.
7. О поручении депозитарию общества ЗАО «Лидеринвест» оповестить акционеров общества о принятом решении «О покупке акций на баланс общества».

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, 26 апреля 2019 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 в рабочие дни с 30 апреля 2019 г.

**Регистрация участников собрания – с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

**Сведения по телефонам: 334-35-43, 334-33-83.**

УНП 100364117

# ГОРКІ ДОСВЕД ЗАПАТРАБАВАНЫ

**За 33 паслячарнобыльскія гады мы, жыхары Гомельшчыны, пазбавіліся радыефобіі. Гэта не азначае, што цалкам адчулі бяспеку і забыліся пра нябачную пагрозу. Гэта азначае, што і самі навучыліся жыць у гэтых умовах, і цяпер дзелімся досведам з тымі, хто таксама пацярпеў ад радыяцыі. У першую чаргу размова пра японцаў, якія прыязджаюць на Гомельшчыну для таго, каб пераадолець свае страхі і пераняць вопыт, набыты беларусамі.**

— Дарэчы, апошнія дзесяць гадоў на чарнобыльскіх тэрыторыях дэмаграфічныя працэсы знаходзяцца ў збалансаваным стане, — адзначае **начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі і па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый РУТКОЎСКІ.** — Яшчэ нядаўна ў вобласці лідарам па нараджэнні дзяцей быў Хойніцкі раён, зараз — Брагінскі. Маладыя спецыялісты, якія прыязджаюць працаваць у так званыя чарнобыльскія раёны, адразу ж забяспечваюцца бясплатным жыллём, атрымліваюць вялікія «пад'ёмныя» згодна з кантрактам. Да таго ж ім выплачваюцца пэўныя надбаўкі да заробку. На гэтых тэрыторыях актыўна развіваецца сацыяльная сфера — і людзі хочуць там жыць, працаваць і не баяцца нараджаць дзяцей. Што датычыцца фобій — пачынаючы са школы і дзіцячага садка паўсюдна вядзецца інфармацыйная работа пра выкананне ў штодзённым жыцці неабходных мер бяспекі. Людзі бачаць, што ў развіццё тэрыторый укладаецца значнае фінансаванне, і разумеюць, што іх не пакінула дзяржава.

Цяпер у краіне рэалізуецца шостая дзяржпраграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Калі першыя былі скіраваны на адраджэнне пацярпелых тэрыторый, то дзве апошнія — на іх сацыяльна-эканамічнае развіццё. Асноўныя акцэнты — аздараўленне насельніцтва, дыспансерызацыя і выкананне сацыяльных нарматываў, нагадвае Дзмітрый Міхайлавіч:

— Адначасова з аздараўленнем насельніцтва і правядзеннем дыспансерызацыі мы будуем вытворчасці, аб'екты сацкультбыту і жыллё для маладых спецыялістаў, павялічваем колькасць рабочых месцаў. Дарэчы, з 2011 года на набыццё абсталявання і тэхнікі па дзяржпраграме накіравана 22,3 мільёна рублёў. Напрыклад, для ўстаноў аховы здароўя рэгіёна закуплена 327 адзінак лячэбна-дыягнастычнага абсталявання на суму 8,6 мільёна рублёў (каля 70 з іх у 2018-м). У школьных сталовых устаноўлена 300 адзінак халадзільнага і тэхналагічнага абсталявання. Для падвозу навучэнцаў набыта 39 школьных аўтобусаў.

Да таго ж аўтапаркі арганізацый раёнаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, летась папоўніліся 220 адзінкамі сельскагаспадарчай тэхнікі. План на гэты год — каля 600 такіх агрэгатаў. З 2011 года на Гомельшчыне за кошт сродкаў дзяржаўных праграм па пераадольванні наступстваў катастрофы на ЧАЭС уведзена і рэканструявана 46 малочнатаварных фермаў. Ужо ў самай бліжэйшай будучыні яны таксама з'явяцца ў Брагінскім, Хойніцкім і Чачэрскім раёнах.

— Пасля катастрофы на Чарнобыльскай станцыі каля 216 тысяч гектараў былі выведзены з сельгасабароту, — гаворыць Дзмітрый Руткоўскі. — З таго часу 16 тысяч гектараў ужо вярнулі ў абмежаваны ці поўны сельгасабарот. За мінулы год — каля 1,5 тысячы гектараў у Буда-Кашалёўскім і Кармянскім раёнах. Мы пастаянна займаемся інвентарызацыяй і рэабілітацыяй гэтых зямель. Перыяд паўраспаду асноўных радыеактыўных элементаў — цэзію і стронцыю — закончыўся. Сёння каля 40 % забруджаных тэрыторый ачысцілася. Калі вучоныя пры абследаванні такіх тэрыторый пацвярджаюць, што землі бяспечныя для сельгаскарыстання, яны рэкультывуюцца.

> Цяпер у краіне рэалізуецца шостая дзяржпраграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС. Калі першыя былі скіраваны на адраджэнне пацярпелых тэрыторый, то дзве апошнія — на іх сацыяльна-эканамічнае развіццё.

На ўцягнутых у абарот палетках сёння вырошчваецца чыстая сельгаспрадукцыя. Усе нарматывы на колькасць радыенуклідаў вытрымліваюцца вельмі строга. Дзмітрый Руткоўскі падкрэслівае, што ў нашай краіне самая жорсткая ў свеце сістэма бяспекі:

— У нас вельмі шчыльны кантроль прадуктаў раслінаводства і жывёлагадоўлі. Любы прадукт, які мы прамыслова вырошчваем на гэтых тэрыторыях, абсалютна бяспечны. Для нас гэта не толькі здароўе грамадзян, але і эканоміка. Безумоўна, за 33 гады ў нас набыты вялікі досвед па аздараўленні насельніцтва і рэабілітацыі пацярпелых тэрыторый. Мы дзелімся ім з Японіяй. У нашых краін, якія пацярпелі ад ядзерных катастроф, пастаяннае плённае супрацоўніцтва ў розных кірунках. Тыя дэлегацыі, што прыязджалі да нас апошнім часам, па нашым прыкладзе ўкараняюць на сваіх тэрыторыях многія тэхналогіі, якія садзейнічаюць рэабілітацыі зямель. Да таго ж і людзі, якія бачаць, як мы тут жывём, — разумеюць, што можна плённа кантраляваць гэтыя працэсы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ФЕРМЕРСКАЯ ВЯСНА

**Ёсць вялікія фермерскія гаспадаркі, якія маюць сотні гектараў зямлі, асобныя займаюць цяпер і тысячы гектараў. Тады гаворка ідзе пра вялікія тэхнічныя паркі, комплекс гаспадарчых пабудоў, развітую інфраструктуру. Але такіх у нас пакуль няшмат. Найбольш фермерскіх гаспадарак рэгіёна так званыя сераднячкі альбо і зусім невялікія.**

Многія з іх працуюць даўно і стабільна, людзі маюць работу, якая іх задавальняе, і даход, што забяспечвае сям'ю. Фермерскай гаспадарцы Барушкаў з Бярозаўскага раёна налета споўніцца 20 гадоў. Пачынаў Аляксандр Іванавіч свой аграрны бізнес з трох гектараў зямлі. Потым гаспадарка стала пашырацца, узялі яшчэ 30 гектараў, цяпер маюць 55 гектараў ворыва. На палях вырошчваюць чорныя парэчкі, буякі, клубніцы, маліны, крыху агародніны, крыху збожжавых.

Увесь час папаўняецца тэхнічны парк. Не так даўно купілі камбайн для ўборкі парэчак. Набылі таксама грузавую фуру-халадзільнік для перавозкі ягад. Бо вырасціць ураджай на глебе з каэфіцыентам 20 балаў не самае складанае, самае цяжкае — яго прадаць. Таму фермеры арыентуюцца на замежны рынак. Увесь час вар'іруюць свой севазварот: то больш парэчак пасадзяць, то адвядуць большую плантацыю пад яблыкі, то пасадзяць многа клубніц. Даводзіцца прагназаваць, рызыкаваць, страчваць і выйграваць.

— Працаваць самастойна — цікава, — расказала жонка фермера Вера Віктараўна, — калі сам нясеш выдаткі, сам адказваеш за вынік. Мы не разлічваем на вялікія даходы, нам не трэба яхтаў ці велізарных віл. Нам трэба, каб была работа, якая забяспечвае годнае існаванне сям'і, і мы такую работу маем.

Васіль Макейчык з Лунінецкага раёна назваў сваю гаспадарку дробнай. У яго толькі 37 гектараў. Агульнае ў іх з Аляксандрам Барушкам тое, што абодва раней былі калгаснымі спецыялістамі, маюць профільную адукацыю. Абодва на рубяжы 90-х і нулявых рашылі заняцца ўласнай справай.



Васіль МАКЕЙЧЫК.

Васіля Іванавіча ўдалося застаць па дарозе на пасяўную дзялянку. Фермер за рулём трактара МТЗ-82 ехаў у поле. Як і ў Барушкаў, у Макейчыкаў на гаспадарцы працуе сям'я: Васілю Іванавічу дапамагаюць жонка, дачка з зяцем. Зараз фермеры вядуць сяўбу морквы, іншай агародніны.

Дарэчы, лунінецкая фермерская гаспадарка знаходзіцца на тэрыторыі, якая раней атрымала права на адсяленне, бо забруджанасць пасля аварыі была большая за 5 кюры. Добрую Волю, вёску за восем кіламетраў ад цэнтра сельсавета, тады адсялілі. А Вулька 2 і іншыя навакольныя вёскі засталіся жыць па-ранейшаму. Сюды прыязджаюць спецыялісты, перыядычна бяруць пробы вады, глебы, а таксама пробы малака ў насельніцтва.

— Па выніках праверак, як правіла, усё адпавядае нормам, — расказаў **старшыня Вулькаўскага сельскага Савета Аляксандр КУШНЯРЭВІЧ.** — Фермеры нашы атрымліваюць бясплатна прэпараты для вапнавання глебы ў якасці дапамогі дзяржавы тэрыторыям, якія пацярпелі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

*Бярозаўскі, Лунінецкі раёны.*



Фота Андрэя САЗОНАВА.

# ПЯЦЬ З ПАЛОВАЙ ДААТАМНЫХ СТАГОДДЗЯЎ

## Астравец — горад энергетыкаў — і бяспечная электрастанцыя

**САМАЯ вялізная будоўля ў Еўропе — узвядзенне Беларускай атамнай электрастанцыі — пакрысе блізіцца да завяршэння. Фізічны пуск першага энергаблока АЭС запланаваны на восень 2019-га. Аднак ужо цяпер звонку неба над аб'ектам ахоўвае зенітна-ракетны комплекс, што знаходзіцца на ўзгорку непадалёк ад станцыі. А знутры разам са службай бяспекі кругласутачна дзяжурыць вайсковая часць 7434 унутраных войскаў МУС Беларусі. Акрамя таго, 40 % з 10 мільярдаў долараў, выдзеленых на будаўніцтва АЭС, зрасходаваны менавіта на бяспеку: фізічную і экалагічную. Як гэта ўладкавана на станцыі, высвятлялі падчас выязнога пасяджэння члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, да якіх далучыліся і карэспандэнты «МС».**

Жыхары Астраўца і навакольных вёсак ведаюць, што ў «даатамны перыяд», як тут кажуць, жыццё віравала далёка не так, як цяпер. Беларуская АЭС стала горадаўтваральным прадпрыемствам, дзякуючы якому старажытны Астравец, якому летась споўнілася 550 гадоў, вырас утрая, у ім з'явіліся аб'екты, пра якія раённы гарадок нават не марыў.

Тут, у прыватнасці, завяршаюць аздабленне бальніцы, якой збіраюцца надаць статус РНПЦ. Мяркуецца, што ўстанова будзе працаваць і ў цэлым на рэспубліку, бо тут маецца вельмі сур'ёзнае начынне. А яшчэ Астравец заставаўся адзіным у Гродзенскай вобласці гарадком, дзе не было стадыёна. Цяпер тут шматфункцыянальны спартыўны аб'ект на некалькі паверхаў, дзе знаходзяцца басейн, пляцоўкі для баскетбола, футбола, трэнажорная зала. Побач з будынкам адкрыты стадыён на тысячу месцаў са штучным газонам.

Мясцовыя жартуюць, што жыллё тут будуюць цэлымі кварталамі. І сапраўды, узводзяць адразу па некалькі прывабных дамоў: на тры і чатыры паверхі, паралельна з якімі ствараюць інфраструктуру: дарогі, пешаходныя сцежкі і алеі, робяць іх асвятленне, будуюць садок, школу, краму.

Дарога да АЭС даўжынёй 18 кіламетраў таксама збудавана з нуля. Цяпер гэта мясцовы аўтабан. 7000 работнікаў станцыі штодня пераадольваюць гэты шлях на работу. Кажуць, што прызвычаіліся і не заўважаюць адлегласці.

Гледзячы на панараму станцыі, дзве градзірні і два будынкі рэактара якой, здаецца, узвышаюцца над наваколлем на шмат кіламетраў, бачым, што ледзьве не адразу за плотам станцыі пачынаюцца палі.

— Асаблівасць праекта АЭС у тым, што санітарна-ахоўная зона станцыі супадае з яе перыметрам. Гэта азначае, што на тэрыторыі памерам кіламетр на кіламетр унутры агароджы нельга рабіць нічога, акрамя вырабу электраэнергіі, — кажа **Эдуард СВІРЫД, начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Беларускай АЭС.** — Усё, што звонку, — палі мясцовага сельскагаспадарчага кааператыва, сельгасугоддзі. На месцы, дзе ўзвялі станцыю, знеслі толькі адзін нежылы хутар. Яго гаспадар атрымаў кампенсацыю. Людзей з іншых блізкіх да станцыі дамоў адсяляць не сталі, бо гэта не перашкаджала будаўніцтву.

Гэтым разам карэспандэнты разам з дэпутатамі трапілі ў святая святых станцыі — пакой, дзе змешчаны цэнтральны шчыт кіравання. Пакуль тут ажыццяўляюць прыём электрычнасці для ўласных патрэб АЭС. На абслугоўванні шчыта занятыя тры чалавекі. Супрацоўнікі падбіраюцца на дзяжурства па самых розных параметрах, сярод якіх ледзьве не самы важны — псіхалагічная сумяшчальнасць. Для гэтага на АЭС працуе цэлая псіхалагічная лабараторыя са спецыяльнымі тэстамі. Псіхалагічны кантроль супрацоўнікі праходзяць штодня.

Паліва на станцыю пакуль не завезена. Як толькі гэта здарыцца, узровень аховы АЭС стане яшчэ вышэйшым. Чвэрць адпрацаванага ядзернага паліва штогод трэба, дарэчы, мяняць на новае.

— У спецыяльным басейне вытрымкі паліва захоўваецца дзесяць гадоў, каб яно «астыла» — скончылася рэакцыя распаду — і яго можна было транспартаваць у Расію на перапрацоўчы завод, — расказаў **Сяргей ГОРЫН, намеснік начальніка рэактарнага цэха АЭС.**

Не абмінулі народныя абраннікі і будынак водападрыхтоўкі № 1. Атамны рэактар, нібы вялізны чайнік, трэба абараняць ад своеасаблівага накіпу, які можа ўзнікнуць у працэсе работы. Для гэтага з водазабору на рацэ Вілія на станцыю праз дзве станцыі ачысткі паступае вада, якая належным чынам рыхтуецца ў хімічным цэху. Назад у Вілію трапляе толькі вада, якая задзейнічана ў контуры ахалоджвання рэактара.

— Неабходнасць падачы хімічна абяссоленай вады на энергаблок абумоўлена бяспекай. Хімічна ачышчаная, яна мінімізуе адкладанні, якія могуць з'явіцца на сценках абсталявання і трубаправодаў энергаблокаў, — расказаў **Яўген ЛЕСНІЧЭНКА, намеснік начальніка хімічнага цэха,** які пазнаёміў пра работай установак зваротнага осмасу. — Магутнасці гэтых установак дазваляюць атрымліваць 360 «кубоў» часткова абяссоленай вады ў гадзіну і 90 «кубоў» — хімічна абяссоленай вады. Нарыхтаваная вада будзе захоўвацца ў чатырох баках па 750 літраў.

Для патрэб АЭС неабходна 12 000 кубаметраў вады. На думку вучоных, страты вады з Віліі пры гэтым будуць на ўзроўні 2,2 % і нават у самы спякотлівы год не перавысяць 6 %. Так што адмоўнага ўздзеяння на раку не здарыцца.

— Вынікі ацэнкі ўздзеяння на наваколле паказалі нязначны ўплыў Беларускай АЭС на раку Вілію і іншыя паверхневыя водныя аб'екты. Змяншэнне сцёку на 2—6 % знаходзіцца ў межах прыродных ваганняў гідралагічнага рэжыму гэтай ракі, а пры малаводных умовах як рэзервовыя можна выкарыстаць воды Вілейскага, Снігянскага і Альхоўскага водасховішчаў, — заўважыла **Надзея ЗДАНЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра, змяненне клімату і экспертызы Мінпрыроды.** — Аналіз вынікаў матэматычнага мадэлявання пераносу радыенуклідаў па рацэ Віліі пры іх выкідах у атмасферу з наступным выпадзеннем на паверхню ракі і тэрыторыю водазбору пры аварыі на АЭС, якая адпавядае высокаму ўзроўню INES 6 шкалы ядзерных падзей, паказаў, што прагнозныя канцэнтрацыі радыенуклідаў не перавысяць рэферэнтных узроўняў, прадугледжаных еўрапейскімі нарматывамі і гігіенічнымі нарматывамі Беларусі. Іншага шляху для рыдыенуклідаў трапіць з АЭС у раку Вілію не існуе. А размяшчэнне станцыі з яе характарыстыкамі водаспажывання і водаадвядзення не з'явіцца крыніцай тэхнагеннай паводкі.

Кожны тыдзень ход будоўлі разглядаецца падчас штабоў. Уся работа вядзецца згодна з графікам, праблемных тэм няма, існуюць толькі бягучыя пытанні, якія патрабуюць абмеркавання на ўзроўні заказчыка і генпадрадчыка, паведаміў **Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі Беларусі:**

— З 1 красавіка створаны Дзяржэнергагазнагляд — дзяржарганізацыя, да якой адышлі функцыі па энерга- і газанаглядзе. Ёй перададзены ўсе кантралюючыя функцыі. У межах удасканалення работы мяркуецца стварэнне двух энергетычных газабудаўнічых холдынгаў, што ў далейшым палепшыць эфектыўнасць работы спецыялізаваных будаўнічых арганізацый.

Галоўнай задачай пасля будаўніцтва АЭС міністр бачыць паспяховую інтэграцыю станцыі ў энергасістэму і эканоміку краіны і перадачу аб'екта ў распараджэнне Белэнерга, які непасрэдна будзе займацца эксплуатацыяй станцыі.

**Ірына СІДАРОК.**

## Урад вызначыў, як будуць праходзіць грамадскія слуханні па БелАЭС

**Урад зацвердзіў палажэнне аб грамадскіх слуханнях па пытаннях рэгулявання бяспекі Беларускай АЭС. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 24 красавіка 2019 года № 258, паведамляе БелТА.**

Грамадскія слуханні праводзяцца ў выпадках прыняцця рашэнняў аб выдачы ліцэнзій на права ажыццяўлення эксплуатуючай арганізацыяй дзейнасці ў галіне выкарыстання атамнай энергіі пры размяшчэнні, збудаванні, эксплуатацыі, вывадзе з эксплуатацыі ядзерных установак (энергаблокаў) БелАЭС. Слуханні арганізуюць пераважна ў населеным пункце, размешчаным у непасрэднай блізкасці ад аб'екта выкарыстання атамнай энергіі (БелАЭС), тэрмін вызначаецца Дэпартаментам па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд). Мерапрыемства праводзіцца ў форме сходу. Апавяшчэнне аб слуханнях размяшчаецца не пазней чым за 5 каляндарных дзён да даты іх правядзення.

У грамадскіх слуханнях могуць удзельнічаць грамадзяне Беларусі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства. Пры рэгістрацыі падаецца заяўка на выступленне для фармулявання пазіцыі, меркавання або пытання. Для арганізацыі і правядзення слуханняў Дзяржатамнагляд фарміруе адпаведную рабочую групу.

Як паведамляла раней **начальнік Дзяржатамнагляда Вольга ЛУГОЎСКАЯ,** перад прыняццем рашэння аб выдачы ліцэнзіі на эксплуатацыю Беларускай АЭС пройдуць грамадскія слуханні, гэта можа адбыцца ў жніўні-верасні 2019 года.


### Информация о намерении ОАО «Лукомэнергомонтаж» осуществить приобретение простых (обыкновенных) акций собственного выпуска

### Предложение о покупке акций

**Полное наименование и местонахождение покупателя акций:** Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»; Республика Беларусь, 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район. Контактный телефон покупателя акций – 8 (02133) 60273.

**Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются:** Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»; Республика Беларусь, 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.

**Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о таком приобретении:** для аннулирования и последующего уменьшения уставного фонда в целях сокращения их общего количества.

**Количество приобретаемых акций** – 3000 штук.

**Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции, отчуждаемые акционерами Общества:** 10 (десять) белорусских рублей 00 копеек за одну акцию.

**Срок, форма и порядок оплаты акций:**

• оплата приобретаемых акций осуществляется покупателем акций в срок не ранее 30 (тридцати) календарных дней и не позднее 180 (ста восьмидесяти) календарных дней, следующих за днем зачисления акций на счет «депо» покупателя акций, путем безналичного перечисления денежных средств (белорусских рублей) на банковский счет продавца акций;

• перевод акций со счета «депо» продавца акций на счет «депо» покупателя акций осуществляется продавцом акций в день регистрации договора купли-продажи акций депозитарием покупателя акций путем предоставления в депозитарий поручения «депо» на перевод ценных бумаг.

**Адрес заключения договоров купли-продажи акций:** 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район, ОАО «Лукомльэнергомонтаж».

• **Дата начала и окончания срока представления акционерами предложений о продаже акций:** с 22 апреля 2019 года по 31 мая 2019 года.

• **Дата начала и окончания срока покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций):** с 1 июня 2019 года по 30 сентября 2019 года.

Расходы, связанные с регистрацией сделок по приобретению Обществом акций собственного выпуска и списания акций со счета «депо» продавца, несет Общество в полном объеме.

УНП 300007839



### ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: СООО «Альфа-Калор» (УНП 808000132) в лице антикризисного управляющего ООО «Бухгалтерская компания «СОВЕТНИК», тел. +375 (29) 688-04-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **27 мая 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 09.01.2019 г.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|
| Изолированное помещение с инв. № 250/D-36993 (квартира), общ. площадь 72,2 кв. м, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Вологина, 2Б-36 | 38 370,70 |
| ДАЧИЯ ЛОГАН, рег. знак 9501 IA-7, 2007 г. в. | 2 250,00 |
| ДАЧИЯ ЛОГАН, рег. знак 9502 IA-7, 2007 г. в. | 2 250,00 |
| ДАЧИЯ ЛОГАН, рег. знак 9503 IA-7, 2007 г. в. | 2 250,00 |
| KIA RIO, рег. знак 9180 OP-7, 2001 г. в. | 1 350,00 |
| GAZ 33023, рег. знак АА 4573-7, 2006 г. в. | 1 890,00 |
| Iveco Turbo Daily 40C12, рег. знак АМ 7270-7, 2003 г. в. | 7 470,00 |
| Хафей Мини, рег. знак АЕ 0744-7, 2007 г. в. | 1 620,00 |
| RYDWAN R-EU-LI A750, рег. знак А 9276 А-4, 2013 г. в. | 900,00 |
| Линия покрасочная IMF | 85 858,11 |
| Линия покрасочная IMEL IDV-02 | 218 392,20 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Селицкого, 9, тел. для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-53 | |

**Для участия в торгах необходимо в срок по 24.05.2019 г. 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06-SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Оформление результатов торгов – в день их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня их проведения.



**ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»**
**г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129**

Советом директоров ОАО «Белтрубопроводстрой» от 23 апреля 2019 г. в соответствии со ст. 81 Закон Республики Беларусь от 09.12.1992 № 2020-XII «О хозяйственных обществах» решено для проведения внеочередного собрания сформировать реестр владельцев ценных бумаг на 26 апреля 2019 г.

УНП 100364117



### ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже здания школы, интерната с принадлежностями, расположенного по адресу: Волковысский район, деревня Малая Лапеница, улица Школьная, дом 1, 1/1, 1/2, 1/3, 1/4, 1/5. Начальная цена продажи – 61 279 рублей 44 копейки; размер задатка – 6200 рублей.

АУКЦИОН СОСТОИТСЯ **27 мая 2019 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, дом 39. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **21 мая 2019 г. до 17.00.**

Подробная информация по телефонам: в городе Волковыске – (801512) 4-50-25, 4-53-83; в городе Гродно – (80152) 772915, 722518, 722102, сайты www.region.grodno.by, gki.gov.by.

УНП 500842593



Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 2669677 **считать недействительными.**

УНП 100122726

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# ТАМ, ДЗЕ НІХТО НЕ ЖЫВЕ...

**Хутка Радаўніца і народ зноў паедзе да месцаў пахаванняў сваіх продкаў. Нават там, дзе вёскі сцёр з твару зямлі каварны Чарнобыль, могілкі працягваюць жыць. І застаюцца адзіным месцам, дзе сустракаюцца былыя суседзі, іх дзеці і ўнукі. У Чэрыкаўскім раёне такіх могілак 13 з 81. І як адзначылі ў Магілёўскім абласавеце дэпутатаў, тамтэйшыя народныя абраннікі вельмі далёка прасунуліся ў навядзенні парадку на іх. Едзем пераймаць вопыт.**

## Хто тут галоўны?

— Тыя пахаванні, якія знаходзяцца ў горадзе і аграгарадках, заўсёды выглядаюць больш дагледжанымі — там часцей бываюць жыхары, старасты, актыў. Улады таксама прымаюць удзел, але мінімальны — у асноўным калі трэба агароджу паправіць, смецце вывезці, аварыйнае дрэва знесці. Іншая справа, калі населены пункт малы або яго зусім няма, — кажа **Анжэла НОВІКАВА, старшыня Чэрыкаўскага райсавета дэпутатаў.**

Звычайна ў такіх выпадках за могілкамі замацоўваецца адказны за парадак — прадпрыемства або нейкая арганізацыя. На жаль, гэта яшчэ не гарантыя таго, што там будзе чысціня. У Чэрыкаве вырашылі крыху змяніць падыход. Прапанавалі кіраўнікам узяць пад апеку менавіта тыя могілкі, дзе пахаваныя іх родныя. І трапілі ў дзясятачку. Бо начальнікам, калі яны не паклапоцяцца пра парадак, сорамна будзе не толькі перад сваімі памерлымі продкамі, але і перад суседзямі.

— У выніку мы часцей сталі чуць ад насельніцтва «дзякуй», — кажа Анжэла Міхайлаўна. — Акрамя гэтага, у кожным населеным пункце свае традыцыі і мы знайшлі людзей, з якімі часцей за ўсё кантактуюць земляки наконт стану могілак. Яны сталі нашымі памочнікамі і кансультантамі.

Балючая тэма сельскіх могілак — гэта стыхійныя сметнікі. Алеі тут знойдзецца выйсце.

— Мы стварылі спецыяльныя зоны складзіравання смецця, але некаторыя людзі працягваюць выкідваць там, дзе ім зручна, — дзеліцца напрацоўкамі старшыня райсавета. — Паколькі нашы могілкі часцей за ўсё ў лесе, мы звярнуліся да лясгаса, каб яны ўзмацнілі работу па ахове тэрыторыі ад смецця. У іх ёсць фотапасткі, іншыя сучасныя сродкі нагляду, з дапамогай якіх можна ўстанавіць вінаватых. Павінна быць культура паводзін на грамадзянскіх могілках. Зразумела, што на гэта спатрэбіцца час, бо нічога проста так не адбываецца.

## Дзе ўзяць грошы на агароджу

Летась выдаткі на ўтрыманне могілак склалі ў Чэрыкаўскім раёне 20—25 тысяч рублёў. І гэта з улікам агароджы, афарбоўкі, вывазу смецця, зносу аварыйных дрэў і ўсяго астатняга.

— Дзеля таго каб знізіць выдаткі, сельскія выканкамы абмежаваліся толькі набыццём піламатэрыялаў, — кажа Анжэла Новікава. — Усе астатнія работы па агароджах выконваліся на бязвыплатнай аснове. Агарадзіць адны могілкі каштуе сёння 200—300 рублёў. Гэта — мізэр. І няма апраўдання тым, хто скардзіцца на недахоп сродкаў на гэтыя мэты. Ніхто не патрабуе, каб у лясным масіве была агароджа з жалезабетону, дастаткова абнесці па перыметры гарызантальнымі піламатэрыяламі. Там, дзе жыхары супраць, прапануем зрабіць нешта больш дасканалае, але з іх удзелам. Напрыклад, матэрыял наш, а афарбоўка і навядзенне парадку за імі. І яны пагаджаюцца.

Нятанна каштуе знос аварыйных дрэў, бо тут прыходзіцца карыстацца паслугамі альпіністаў. А такіх дрэў вельмі шмат, бо па-сур'ёзнаму імі пачалі займацца ў раёне толькі летась.

— Пятнаццаць прычэпаў дроў вывезлі трактарамі толькі з адных могілак, — дэманструе фота на мабільніку дэпутат. — Бачыце, як дрэвы згнілі знутры. За сакавік — красавік адпрацавалі ўжо 30 магільнікаў. Летась зрабілі столькі ж.

## І для асацыялаў знайшлася работа

У Чэрыкаве ўлада, у тым ліку і дэпутаты, актыўна працуе з базай даных па дэкрэце № 3, скіраваным на садзейнічанне занятасці насельніцтва.

— Кожны дзень мы складаем вось такія зводкі, дзе па кожным населеным пункце распісваем, хто з мясцовых нам дапамагаў, — дэманструе справаздачы Анжэла Новікава. — Навядзенне парадку на зямлі — гэта менавіта тое, дзе можна чалавека заняць. У нас пры кожным сельскім камітэце створаны брыгады з ліку беспрацоўных для прыборкі тэрыторый.

Яна зноў дастае мабільны і паказвае, як шчыруюць, здавалася б, ужо ні на што не годныя работнікі.

— Вось бачыце, тры такія беспрацоўныя займаюцца добраўпарадкаваннем грамадзянскіх могілак, — каментуе яна фота. — Было б бесчалавечна зусім адмовіцца ад іх. Мы ж не ведаем, што прывяло іх да такога ладу жыцця. Замест таго каб папікаць, запрашаем прыбіраць несанкцыянаваныя звалкі, заораснікі, смецце вынесці або перасартаваць.



Анжэла НОВІКАВА: «І кожны падворак як на далоні».

## Квадракоптар у памочніку

Выяўляць праблемныя ўчасткі на тэрыторыі раёна дапамагае чэрыкаўскім дэпутатам перадавая тэхніка. Разам са старшынёй глядзім у камп'ютары на вёскі з вышыні палёту квадракоптара.

— З яго дапамогай вызначаем, дзе калодзеж разбурыўся, дзе зараснік утварыўся, дзе несанкцыянаваны сметнік схаваўся, — тлумачыць яна. — Аб'ехаць адным махам усе населеныя пункты, якіх у нас шмат, складана. Так прасцей і менш затратна. Квадракоптар — маёмасць лясгаса, але яны нам дапамаглі. І мы цяпер ведаем, з чаго пачынаць. Вось глядзіце: вёска Селішча — карцінка цудоўная — контуры выраўненыя, звалак няма. Але, на жаль, так не ўсюды. У нас шмат такога відэаматэрыялу, мы вельмі плённа папрацавалі. Вось паглядзіце на Язёры. Вёска вялікая. Пасля абследавання ўбачылі, хто як зямельнымі ўчасткамі карыстаецца. Нехта даглядае, але нехта — то карыстаецца, то не. Калі яны ўбачылі, што прыехала тэхніка заараць, адразу ж пачалі пісаць заявы на сенакашэнне і на пашу. Па могілках, асабліва аддаленых, таксама пытанні вырашыліся. Галоўнае — унікнуць у праблему, тады і змагацца з ёй будзе нескладана.

## Вёсак няма, а могілкі — жывуць

Разам з **Вольгай УЛАСЕНКАЙ, старшынёй Вепрынскага сельскага Савета,** едзем пераканацца, ці сапраўды могілкі ўжо гатовы да прыёму наведвальнікаў на Радаўніцу. Цікавая акалічнасць: сельсавет існуе, а населенага пункта з назвай Вепрын няма ўжо 20 гадоў. Забруджанасць яго тэрыторыі цэзіем-137 і сёння складае ад 15 да 40 кюры.

Вёсак у яе няшмат, усяго дзевяць, але ўсе яны раскіданы па тэрыторыі. Да крайняй ад сельсавета — 55 кіламетраў. Самыя вялікія населеныя пункты — аграгарадок Майскі, дзе знаходзіцца сельсавет, і Гронаў — там жыве каля 300 чалавек. І што цікава, аж сем гронаўскіх сем'яў — шматдзетныя! Вёска адносіцца да пасяленняў з перыядычным радыяцыйным кантролем — забруджанасць яе цэзіем-137 складае ад пяці да 15 кюры на квадратны кіламетр. Але тут вельмі прыгожа і ўтульна. Шмат дрэў, а агароды выходзяць проста да ракі Сож.

Гронаўскія могілкі хаваюцца ў лесе. Акуратны штыкетнік пафарбаваны ў прыемны воку зялёны колер. І веснічкі надзейныя — з ручкай і запорам. На ўваходзе сустракаем Тамару Сяргееўну. У яе тут пахаваная маці.

— На могілках у нас заўсёды парадак, як і павінна быць, — кажа пенсіянерка. — Пра гэта і людзі, і сельсавет клапоцяцца. Раней мы жылі ў іншым населеным пункце гэтага раёна, потым купілі тут дом і пераехалі. У нашых Грыўках сёння зусім мала людзей. Туды мы цяпер ездзім толькі на могілкі. Там такая ж чысціня. Наогул у раёне гэтыя месцы вельмі добра дагледжаюцца.

Яшчэ некалькі кіламетраў на дэпутацкіх «Жыгулях» — і мы ў Вепрыне. Уздоўж дарогі растуць высачэзныя сосны і бярозы. І сярод іх сіратліва хаваюцца яблынькі і кусты бэзу.

— Толькі па іх сёння можна здагадацца, што тут раней стаялі дамы, — кажа Вольга Уласенка. — Вёска была вельмі вялікая, тут жыло каля тысячы чалавек. І могілкі таксама вялікія. Калі нехта з былых жыхароў памірае, яго вязуць сюды. Нават з Мінска.

Побач з могілкамі знак, які папярэджвае, што зона — небяспечная і тут не трэба доўга затрымлівацца. Але людзей, чые родныя тут ляжаць, гэта не палохае. Калі заходзіш за агароджу, першае, што бачыш, гэта свежае пахаванне. З партрэта сумна глядзіць на нас зусім не стары мужчына.

— За мінулы год на могілках сельсавета, якія знаходзяцца ў зоне адчужэння, паявілася каля 30 новых пахаванняў, — кажа дэпутат. — Запомніўся адзін выпадак. Муж прывёз хаваць жонку і вельмі гараваў, што не зможа жыць без яе. На выгляд быў досыць моцны, не такі і стары. А ў хуткім часе прыехаў яго сын і паведаміў: бацька памёр...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ❍ У тэму

**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласавета дэпутатаў:**

— Месцы пахавання ў нас на асаблівым кантролі, сельскія выканаўчыя камітэты пры неабходнасці прыцягваюць зацікаўленыя арганізацыі, каб аказалі садзейнічанне ў навядзенні парадку і падрыхтоўцы могілак да рэлігійных свят. Бо ў гэтыя дні тут будзе асабліва шматлюдна. Магчыма, дзесьці яшчэ ўзнікаюць пытанні з вывазам смецця, бо насельніцтва зараз таксама наводзіць парадак на месцах пахаванняў сваіх блізкіх і кантэйнеры запаўняюцца вельмі хутка. Але дадзены даручэнні, каб графікі вывазу адходаў з могілак былі перагледжаныя. Адначасова вядзецца работа па зносе аварыйных дрэў. Народныя абраннікі павінны адсочваць, як усе гэтыя дзеянні выконваюцца на месцах.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 25 красавіка 2019 года.**